Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 4 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 70 к.
„ 3 „	2 р. — к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрэсу: іншагародзяя	— 20 к.
мясцовыя	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок шпальтовага пасьля тэксту	— р. 50 к.
За радок шпальтовага наперад тэксту	1 р. — к.
За радок шпальтовага перад тэкстам	1 р. 50 к.

Сьпешныя на 50 проц. даражэй.

Зьмяна тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумэнт	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Бесправоўя, і чырвонаармейцы за дакумэнт	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 5 (2193) Пятніца, 6-га студзеня 1928 г.

СЁНЬНЯ РАСПАЧЫНАЕ ПРАЦУ ДРУГАЯ СЭСІЯ ЦВК БССР.

Сёньня а 6 гадзіне ўвечары ў клюбе Карла Маркса (зрыцельная заля) адбудзецца адчыненьне II сэсіі ЦВК БССР.

ПАРАДАК ДНЮ СЭСІІ:

1. Бюджэт БССР на 1927-1928 г. (Даклад СНК і садаклад Бюджэтнае Камісіі ЦВК БССР).
2. Становішча і далейшыя пэрспэктывы разьвіцьця народнае гаспадаркі БССР (дакл. т. Галадзед).
3. Аб сыстэме народнае асьветы (дакл. т. Баліцкі).
4. Рацыяналізацыя савецкага апарату і задачы яго ўзмацненьня (дакл. т. Калнін).
5. Зьмены ў складзе ўраду БССР (дакл. т. Хацкевіч).
6. Зацьверджаньне законаў, прынятых паміж першай і другой сэсіямі ЦВК БССР (дакл. т. Хацкевіч).

Сэкратар ЦВК БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

Сёньня, 6-га студзеня, а 5 гадзіне ўвечары ў клюбе Карла Маркса (зрыцельная заля) адбудзецца пасяджэньне фракцыі КП(б)Б II-й сэсіі ЦВК БССР.

Адказны Сэкратар фракцыі КП(б)Б Прэзыдыуму ЦВК БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

Другая сэсія ЦВК БССР.

Сёньня адчыняецца 2-я сэсія Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР. Сэсія зьбірацца ў момант, калі Савецкая Беларусь уступіла ў дасяты год свайго дзяржаўнага існаваньня. Толькі што адзначаны дзевяцігадовы юбілей існаваньня БССР паказаў тыя вялізарныя посьпехі, якія Савецкая Беларусь мае, якіх яна дамагалася ў выніку цяжкае і ўпартае барацьбы. Барацьбу на гаспадарчым фронце Савецкая Беларусь распачала ва ўмовах недзь ня поўнага зруйнаваньня ўсяе народнае гаспадаркі. Імпэрыялістычная і грамадзянская вайна спалілі нашы фабрыкі і заводы, зруйнавалі сельскую гаспадарку.

Другая сэсія ЦВК па дакладу аб пяцігадовым плане народнае гаспадаркі і па бюджэту БССР на 1927-28 г. ужо будзе мець магчымасьць сьцьвердзіць, што народная гаспадарка Савецкай Беларусі дасягнула свайго даваеннага ўзроўню і ў шмат якіх галінах ужо яго пакінула далёка ззаду. Час, які мінуў ад апошняга Ўсебеларускага Зьезду Саветаў да 2-й сэсіі, прынёс Савецкай Беларусі значнае паляпшэньне матар'яльнага дабрабыту ўсіх працоўных мас рэспублікі і значнае паляпшэньне ўсяе нашае народнае гаспадаркі. Па дакладу т. Галадзеда сэсія распрацуе дэтальны плян разьвіцьця нашае гаспадаркі на бліжэйшыя пяць гадоў. Гэта значыць, што мы давялі нашую народную гаспадарку да гэткага ўзроўню, што ўжо маем магчымасьць складаць плыны ня толькі на паўгода, ці на год, але і на цэлае пяцёхгодзьдзе. Толькі плянавае разьвіцьцё гаспадаркі нам дасьць магчымасьць правільна разьмеркаваць нашыя сродкі, кінуць іх туды, дзе гэта нам патрэбна і дзе яно дасьць у найбольш кароткі тэрмін найбольшы гаспадарчы эфэкт.

Гаспадарчая пяцёхгодка адначасна высоўвае перад намі «пяцёхгодку» нашага культурнага будаўніцтва. Для нашага будаўніцтва нам патрэбны кваліфікаваныя рабочыя і спэцыялісты, якія ведаюць нашыя ўмовы, для таго, каб было менш памылак пры надыходзячым разгортваньні буйнага будаўніцтва. Пераход ад саматужнага абсталяваньня нашых фабрык і заводаў да вышэйшае тэхнікі і рацыяналізацыі вымагае ад нас узьняцьця культурнага ўзроўню ўсяе насельнасьці рэспублікі і, галоўным чынам, тых працаўнікоў, якія непасрэдна будуць браць удзел у гэтым новым будаўніцтве.

Таму даклад Народнага Камісарэ Асьветы т. Баліцкага аб сыстэме народнае асьветы набывае асаблівае значэньне. Нам патрэбна прадугледзіць, каб не стварылася вострае разыходжаньне «ножніц» паміж разьвіцьцём нашае тэхнічнае культуры і духоўнае культуры. На разьвіцьцё матар'яльнае культуры мы зараз сканцэнтравалі галоўную сваю ўвагу, на гэты фронт мы кінулі свае галоўныя сродкі. Але поруч з гэтым нам заўсёды трэба памятаць, што наш нізкі культурны ўзровень зьяўляецца галоўнаю перашкодаю на шляху да пераходу на інтэнсыўную гаспадарку, на рацыяналізаваную, высока-тэхнічна пастаўленую прамысловасьць. Гэтым і тлумачыцца той факт, што на 2-ой сэсіі ЦВК пытаньне аб сыстэме народнае асьветы канчаткова яшчэ вырашана ня будзе. Сэсія толькі абгаворыць тэзісы т. Баліцкага, шырокія працоўныя масы нашае Рэспублікі атрымаюць магчымасьць прыняць актыўны ўдзел у абгаварэньні гэтае сыстэмы, пасьля чаго наступны зьезд Саветаў, або сэсія ЦВК БССР канчаткова вырашыць пытаньне аб нашай сыстэме народнае асьветы.

Сэсія таксама разгледзіць пытаньні аб рэарганізацыі і спрашчэньні савецкага апарату і аб пашырэньні правоў мясцовай улады. Гэтаму пытаньню ўрад БССР у апошнія месяцы зьвяртае шмат увагі. Лёзунг аб рэжыме эканоміі, аб максымальнай эканоміі сродкаў для нашага эканамічнага і культурнага будаўніцтва заўсёды стаяў у парадку дню працы нашага ўраду. Пры дапамозе нашай камуністычнай партыі і шырокіх працоўных мас Рэспублікі нам удалося скараціць нашыя адміністрацыйныя выдаткі і гэтыя сродкі пусьціць на справу індустрыялізацыі. Але мы ня можам спыніцца на сучасных дасягненьнях. **Мы можам зрабіць значна больш, нашы посьпехі павінны быць павялічаны.**

Спрашчэньне савецкага апарату намі праводзіцца ня толькі з пункту гледжаньня эканоміі сродкаў, але таксама з мэтаю набліжэньня яго да насельніцтва і спрашчэньні яго непасрэднае пабудовы. Ленін вучыў нас пабудаваць апарат як магчыма больш гнуткім і лёгкім, каб кожны рабочы і селянін у любы час мог да яго зьвярнуцца і атрымаць тое, што яму трэба. У гэтай галіне намі яшчэ мала зроблена. Наш апарат яшчэ вельмі далёка ад ідэальнасьці. Наш судовы апарат яшчэ працуе так, што цэлыя гады цягнецца тая ці інчая справа. Нізавы савецкі апарат мае шмат абавязкаў, але вельмі мала правоў. У гэтым сэнсе нам трэба пераглядзець нашую адміністрацыйную сыстэму.

Перад сэсіяй, такім чынам, стаіць цэлы шэраг адказных задач. Бюджэт на 1927-28 г., які сэсія будзе зацьвярджаць, павінен адбіць усе тыя задачы, якія перад намі высоўваюцца сучасным момантам. Сэсія павінна будзе ўлічыць увесь той вопыт, які на мясцох накапіўся пры складаньні мясцовых бюджэтаў, а таксама выходзячы з патрабаваньняў рабоча-сялянскіх мас.

Асноўны шлях нашага разьвіцьця вызначаны. Рабочыя і сяляне Савецкае Беларусі ведаюць, куды мы ідзём, ведаюць, што мы будуем сацыялізм у нашай краіне, ведаюць, што сусьветны імпэрыялізм заўсёды можа перашкодзіць нашаму мірнаму будаўніцтву. З поўнай сьвядомасьцю тае вялікае адказнасьці, якую ўскладае ў сучасны момант, 2-ая сэсія Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР распачне сваю працу.

Барацьба пачынаецца.

БЭРЛІН. Пасьля таго, як трацейская пастанова наконт канфлікту ў саксонскай мэталёвай прамысловасьці была адхілена прадстаўнікамі рабочых і прадпрыёмцаў, рабочыя сталялітнага заводу ў Грэліцы (Саксонія), адпрацаваўшы 8 гадзін, пакінулі працу. Пасьля перамоў між прадстаўнікамі рабочых і адміністрацыяй, якія не далі ніякіх вынікаў, завод зачынен. Тое-ж самае здарылася і на іншых заводах.

Савецкая нафта на рынках Англіі.

ЛЁНДАН, 4-I. Шмат якія лёндонскія газэты друкуюць гутарку Фрыдмана, намесьніка старшыні праўленьня Нафтасындыкату. Тав. Фрыдман заявіў, што хоць увоз савецкае нафты ў Англію ў працягу 1927 г. зьменшыўся, аднак тым ня менш звароты РОПП'у (таварыства па продажу савецкіх нафтапрадуктаў) па продажу павялічыліся на 52 проц., што дае магчымасьць зьліквідаваць значную частку запасаў РОПП'у ў Англіі.

Фрыдман далей заявіў: савецкі ўвоз у Англію зусім не пацярпеў у выніку нападак „Дэйлі Мэйль“.

ПОСЬПЕХ ГАСТРОЛЯЎ ДЗЯРЖАЎНАГА ХОРУ СССР У ЛАТВІІ.

РЫГА, 4-I. У латвійскай нацыянальнай оперы адбыўся першы канцэрт савецкага дзяржаўнага хору. Канцэрт прайшоў з небывалым посьпехам пад нясупынныя авацыі ўсяе залі.

Друк аднадушна дае высокую ацэнку канцэрту. Так, навет крайняя правая газэта „Латвіс“ піша: „Хор на віртуёзнасьці і тэхніцы выкананьня дасягнуў самых высокіх ступеняў мастацтва“. Газэта „Подзя Брыды“ называе дасягненьні хору „небачанымі“ і лічыць, што яны магчымы „толькі ў краі, які высока стаіць інтарэсы культуры“. Газэта піша, што дзеяздзённы пабыт савецкага дзяржаўнага хору ў Рызе зьяўляецца выдатнаю падзеяю ў культурным жыцьці Латвіі.

Голас працаўнікоў з месц.

(Гутаркі з членамі ЦВК БССР).

Вёска актыўна рыхтуецца да перавыбараў у саветы.—Пры загатоўках сыравіны мае месца нездаровая канкурэнцыя.—Падручнікі на беларускай мове прысылаюцца несваячасова.—Больш увагі на ўцягненьне ў школы сялянскай моладзі.

ТАВ. СТАЛЯРОЎ.

(Рабочы Гомельскага заводу „Рухавік Рэвалюцыі“).

— На маю думку, у 5-цігадовы плян разьвіцьця нашай прамысловасьці трэба ўнесьці больш выдаткаў на абсталяваньне і мэханізацыю тае прамысловасьці, якая выпускае машыны для сельскай гаспадаркі.

Таксама трэба павялічыць выдаткі на шляхавае будаўніцтва, асабліва на

будаваньне шосаў, а таксама на разьвіцьцё партыйных школ.

Мала ў нас зварочваецца ўвагі на культурную апрацоўку сялянскай моладзі. Школы сялянскай моладзі далёка пяноўна могуць уцягнуць моладзь у свае сьцены. Тым часам бяз сталай культасьветнай працы ў школах наша сялянская моладзь ня зможа атрымаць сыстэматычнай сельска-гаспадарчай і палітычнай асьветы.

У галіне жыльлёвага будаўніцтва трэба ператварыць папённую плату на лес. Трэба таксама даваць больш крэдытаў на жыльлёвае будаўніцтва і на рамонт паасобным рабочым.

ТАВ. КАРАНЕЎСКІ.

(Старшыня Койданаўскага РВК).

— Для ўцягненьня ў перавыбары ў саветы шырокіх мас працоўных лік выбарчых вучасткаў у райёне павялічан на 42. Вялікія вёскі, дзе ёсьць шмат насельніцтва, будуць разьбівацца па некалькі выбарных вучасткаў. Па ўсіх вёсках будуць праведзены сходы беднаты, жанчын, моладзі і райённыя

канфэрэнцыі дэмабілізаваных чырвонаармейцаў.

Для нацменшасьцяй выдзелены асобыя выбарныя вучасткі—польскія і яўрэйскія.

Мы спадзяёмся, што перавыбары гэтага году дадуць добрыя вынікі; нарукай гэтаму зьяўляецца ўзросшая актыўнасьць насельніцтва, якая назіралася ў часе перавыбарнай кампаніі спажывецкай і с.-г. каапэрацыі.

За мінулы год у нашым райёне было праведзена земляўпарадкаваньне на 7000 гэкт.; мэліяратыўныя т-вы асушылі больш 200 гэкт. балот; на шматполлае праведзена каля 500 гэкт., апрача тае зямлі, дзе зараз праводзіцца земляўпарадкаваньне.

Вось толькі бяда, што лесу мала, асабліва будаўнічага. Для апалу ў нас ужываюць торф, якога сёлета было здабыта 1800 куб. сажняў.

У райёне можна заўважыць слабую забясьпечанасьць школьнымі будынкамі. Дрэнна пасоўваецца справа ў галіне ўпарадкаваньня лясоў мясцовага значэньня. Для нагляду са лясамі мясцовага значэньня трэба вызначыць спэцыяльнага лясьнічага ці хоць-бы абъезчыка.

Трэба пераглядзець усю сыстэму працы ў РВК і сельсаветах. Гэтыя установы бываюць вельмі перагружаны ўсялякай папяровай перапіскай, зьмяншыць якую не над сілу РВК. Дзеля гэтага неабходна ў першую чаргу паленшыць у райёне тэлефонную сувязь.

ТАВ. ВІНАГРАДАЎ.

(Старшыня Лоеўскага РВК, Гомельскай акругі).

— Да перавыбараў у саветы на мясцох рыхтуюцца досыць актыўна.

У параўнаньні з мінулым годам сёлета праводзіцца больш сходаў беднаты, жанчын, дэлегацкіх сходаў, моладзі, батракоў. Каб уцягнуць у перавыбарную кампанію прадстаўнікоў нацменшасьцяй, для іх наладжваюцца асобныя сходы. У часе перавыбарнай кампаніі будзе вывучацца пытаньне, у якіх мясцох можна будзе арганізаваць новыя нацсаветы.

Загатоўкі сыравіны разьвярнуліся досыць здавальняюча. Але бяда ў тым, што паміж загатоўчымі органамі скуртрэсту і с.-г. каапэрацыі існуе нездаровая канкурэнцыя. Зусім слушна, што гэткі падыход да справы выклікае толькі ажыятаж.

Дрэнна ў нас справа з лесам. Да гэтага часу яшчэ ня спрошчана працэдура воднуску лесу з лясьніцтваў. Таксама нічога ня робіцца ўсяля таго,

каб упараджаваць лясы мясцовага значэньня. Сялянства нават і грошы ўнесла на лесаўпарадкаваньне, а справа стаіць на адным месцы. Адным словам, лясы мясцовага значэньня знаходзяцца зараз на правох бясспрытульнага; калі справа так працягнецца далей, то хутка нават і карчы павыдзіраюць.

Праўда, торфу ў нас не бракуе, але чамусьці да гэтага часу нельга атрымаць патрэбнае абсталяваньне для торфараспрацовак, якое ўжо даўно выпісана праз с.-г. каапэрацыю.

Наш райён балотны, і тут шырокая глеба для разьвіцьця мэліярацыі сярод сялянства. Але юрыдычнае афармленьне т-ваў цягнецца гадамі, запал сялянства да асушкі сваіх багнаў астывае, а з часам і зусім перастаюць цікавіцца гэтым пытаньнем.

Дрэнна яшчэ і тое, што земляўпарадкаваньне праводзілася ў нас некаторы час (да 1924 г.) саматугам: граніцы абмерылі, а ўнутрысяменнае земляўпарадкаваньне не праведзена. Пры такіх умовах сялянства ня можа перайсьці на шматпольле і да больш культурных форм гаспадараньня. На гэту справу трэба зьвярнуць пільную ўвагу.

Новы загад Літве ад жэнеўскіх апякуноў.

Нажым Англіі на Літву?

Парыская газэта «Тан» кажа, што прыехаўшыя адначасна ў Коўню пасланьнікі Францыі і Англіі разам наведаліся да Вальдэмараса, з якім мелі доўгую нараду па пытаньні аб польска-літоўскіх адносінах. Водлуг вестак „Тан» з коўенскіх крыніц, ангельцы робяць нажым на Літву, каб дамагчыся ад апошняе хутчэйшае згоды з Польшчаю.

Газэта «Літоўшэ Рундшау» раіць адносіцца да апошняга паведамленьня „Тан“ з асьцярожнасьцю.

Прысьпешаньне польска-літоўскіх перамоў.

Латвійская газэта «Яўнакос Жынас» паведамляе, што гэтымі днямі прыяжджая ў Коўню прадстаўнік Лігі Нацый, заданьнем якога зьяўляецца прысьпешэньне польска-літоўскіх перагавораў, якія намечаны былі на апошняй сэсіі Лігі Нацый.

А школ літоўскіх так і не адчыняюць...

Літоўскі камітэт у Вільні ізноў зьвярнуўся да польскага міністэрства асьветы з просьбай дазволіць уноў адкрыць літоўскія школы, зачыненыя польскай уладай у часе апошніх рэпрэсій проці ліцьвіноў.

Кантрабандная зброя з Італіі ў Польшчу.

АБУРЭНЬНЕ ЧЭХАСЛАВАЦКАЕ ГРАМАДЗКАЕ ДУМКІ.

ПРАГА, 4-I. Большасьць чэхаславацкіх газэт, у зьвязку з нелегальным правозам італьянскіх кулямётаў праз Вэнгрыю ў Польшчу, сурова нападае на Вэнгрыю. Зазначаючы на грубае пэрушэньне Вэнгрыяю мірнага ўгавору, газэты патрабуюць «дыплёматычнага ўмяшаньня» ў гэтую справу.

У зьвязку з гэтаю справаю між урадамі краёў Малае Антанты адбываецца абмен думкамі, які пакуль што ня скончан.

ПРАДСТАЎНІКІ ДЗЯРЖАЎ У ЗЭЙПЕЛЯ.

ВЕНА, 4-I. Венская «Абэнд» паведамляе, што за апошніх два дні прадстаўнікі амаль што ўсіх дзяржаў па даручэньні сваіх урадаў наведаліся ва ўправу саюзнага канцлера і запытаці растлумачэньняў наконт непаразуменьня ў Сан-Гатардзе, у зьвязку з правозам італьянскае зброі.

З афіцыйных крыніц карэспандэнту ТАСС паведамілі, што крокі, ужытыя прадстаўнікамі чужаземных дзяржаў, мелі выключна інфармацыйны характар.

ШАНХАЙ НА ВАЕННЫМ СТАНОВІШЧЫ.

Напад агентаў Сун-Чуан-фана на арсэнал.

ШАНХАЙ, 4-I. 3-га студзеня салдаты армі Сун-Чуан-фана. пераапранутыя ў цывільную вопратку, спрабавалі заняць шанхайскі вайсковы арсэнал. Між салдатамі Сун-Чуан-фана і мясцовым войскам адбылася стычка. Пяць салдат забіта і 4 арыштаваны. У Шанхаі абвешчана ваеннае становішча.

Рэанцыйны разгул у Ханькоу.

ШАНХАЙ, 4-I. У Ханькоу зачынены ўсе рабочыя, сялянскія, гандлёвыя, жаночыя і студэнцкія саюзы. 1-га студзеня ў Ханькоу было арыштавана 23 камуністы.

АРЫШТЫ.

ШАНХАЙ, 4-I. Кітайскія газэты паведамляюць, што ў гарадох Сучжоу, Цьзянсіне і Шанхаі «захоплены камуністычныя кур'еры», у зьвязку з чым арыштавана шмат камуністаў.

ЛІКВІДАЦЫЯ НЯРОЎНАГА ЎГАВОРУ З ГІШПАНІЯЙ.

ПЕКІН, 4-I. З Шанхаю паведамляюць: суд правінцыі Цьзянсу абвясьціў, што паколькі гішпана-кітайскаму ўгавору скончыўся тэрмін, гішпанскія грамадзяне будуць падлягаць юрысдыкцыі кітайскага, а ня консульскага, ці мешанага суду.

АЦЭНКА МІЖНАРОДНЫХ ДАЧЫНЕНЬНЯЎ ЗА ГОД У НЯМЕЦКАЙ ПРЭСЕ.

БЭРЛІН, 1-1. Падсумоўваючы вынікі замежна-палітычных адносін Нямеччыны за 1927 г., афіцыёзнае выданьне «Дэйтшэ Дыплёматышэ Політышэ Корэспандэнт» да станоўчых зьявішчаў у галіне замежнае палітыкі Нямеччыны за мінулы год далучае канчатковае зьняцьце міжсаюзьніцкага ваеннага кантролю ў Нямеччыне і зьменшаньне ліку акупацыйных армій у Рэйнскай вобласьці на 10 тысяч чалавек. Пачатак мінулага году адзначан некатораю правалочкаю ў справе разьвіцьця палітыкі, распачатае ў Лёкарно і Туары, а таксама тым, што «праблема т. зв. агульнага ўпарадкаваньня спрэчных пытаньняў між Нямеччынаю і Францыяй і, у першую чаргу, праблема разброеньня пасунулася ў параўнаньні з пачаткам мінулага году вельмі нязначна».

У процівагу гэтай афіцыёзнай ацэнкі прэса нацыяналістаў лічыць вынікі мінулага году для Нямеччыны ў галіне замежнае палітыкі цалкам адмоўнымі. Прэса нацыяналістаў зазначае, што Ліга Нацый за мінулы год яшчэ раз даказала сваю поўную нездольнасьць вырашыць галоўныя пытаньні міжнароднае палітыкі, на кажучы ўжо пра не бясьсільнасьць у пытаньні аб разброеньні. Не зважаючы на тое, што ў Лігу Нацый уступіла Нямеччына, Ліга па сутнасьці як і раней, заставалася ў працягу некаторага часу зброяй захаваньня Вэрсальскага міру.

Што датычыць агульнага міжнароднага становішча за мінулы год, дык нямецкі друк з асаблівае падрабязнасьцю спыняецца на англа-савецкім разрыве. Друк адзначае, што ангельскі плян адзінага антысавецкага фронту ня ўдаўся. Асабліва настойліва падкрэсьліваецца гэта «Крэйц Цэйтунг». Газэта зазначае, што Францыя не пашла ў гэтых адносінах за Англіяй і, наадварот, імкнецца да згоды з Масквою. Калі гэтая згода ажыцьцёвіцца, дык яна, водлуг слоў газэты, зробіць вялікі ўплыў на агульнае становішча спраў ва ўсходняй Эўропе.

За дзень.

Перагляд пляну Даўэса.

Амэрыканская прамысловасьць уступіла ў 1928 г. са значным паслабленьнем вытворчасьці. Цэлы шэраг галін прамысловасьці ў мінулым годзе паменшыў свой выраб і поруч з гэтым значна павялічваецца беспрацоўе. У вугольнай прамысловасьці Амэрыкі адбываецца ўзброеная клясавая барацьба. Усё гэта робіць значны ўплыў на фінансавую сыстэму Амэрыкі. Каштоўныя паперы і грошы падаюць у цане. Эканамічны крызіс б'е ня толькі прамысловасьць, ня толькі фабрыкантаў, але і банкіраў, якія спужаліся фінансавага крызісу.

Вось чаму амэрыканскі агент, які знаходзіцца ў Нямеччыне і сачыць за выкананьнем пляну Даўэса, узьняў пытаньне аб перагляндзе гэтага пляну. Справа ў тым, што амэрыканская прамысловасьць у значнай меры цярпіць ад нямецкае канкурэнцыі. Для таго, каб Нямеччына магла выплаціць тую суму, якая ад яе належыць па пляну Даўэса ў 1928 годзе, ёй патрэбна ў два разы павялічыць экспорт. Летаншнія плацежы па пляну Даўэса Нямеччына выплачвала ня з тых сум, якія яна атрымала з экспорту, але з тых крэдытаў, грашовых пазык, якія яна атрымлівала, галоўным чынам, з Амэрыкі. Зараз з Нямеччыны належыць значна больш. Амэрыка ня хоча дапусьціць павялічэньня нямецкага экспорту, а таксама і павялічэньня ўвозу нямецкіх грошай у Амэрыку. Амэрыка пужаецца і эканамічнага крызісу, які зьявіцца вынікам павялічанага экспорту нямецкага, яна пужаецца і фінансавага крызісу, які зьявіцца вынікам увозу сродкаў па рэпарацыях ад Нямеччыны.

Вынікам гэтае небясьпекі зьявіўся плян перагляду ранейшае рэпарацыйнае сыстэмы. Амэрыка выступае з новым плянам, які даў-бы магчымасьць ёй пазбавіцца ўсіх гэтых небясьпек. Амэрыка атрымлівае грошы ад Англіі, Францыі, Італіі і Нямеччыны. Англія, Францыя, Італія выплачваюць Амэрыцы свае даўгі з тых сродкаў, якія яны атрымліваюць ад Нямеччыны. Таму Амэрыка прапануе, каб Нямеччына плаціла толькі ёй. Тыя грошы, якія Нямеччына выплачвае Англіі, Францыі і Італіі, выплачваліся Амэрыцы ў лік іх запазычанасьці. Такім чынам з Нямеччынай будзе мець справу толькі адна Амэрыка.

З другога боку, Амэрыка адмаўляецца браць ад Нямеччыны рэпарацыі ў гатовым выглядзе і будзе браць толькі ў выглядзе прамысловых акцый. А такім чынам, Амэрыка зробіцца неабмежаваным гаспадаром усёй нямецкай прамысловасьці. Гэта дасьць ёй магчымасьць накіроўваць нямецкі экспорт, туды, куды ёй гэта будзе выгадна, і адначасна заўсёды мець магчымасьць актыўна выступаць супроць Англіі, якая зьяўляецца галоўным ворагам Амэрыкі.

Новы плян перагляду ранейшай рэпарацыйнай сыстэмы значна ўзмацніць, пазіцыю Амэрыкі ў Эўропе. Заканчваецца перыяд «уходу» Амэрыкі ад эўрапейскіх спраў, яна зноў пачынае дыктаваць свае ўмовы эўрапейскай буржуазіі. Англія, Францыя і інш. дзяржавы самі апынуліся ў такім становішчы, што яны ня могуць выплачваць свае даўгі Амэрыцы, бо Нямеччына ў сваю чаргу ім ня плаціць. Гэта значыць, што супярэчнасьці ўнутры капіталістычнага лягеру яшчэ больш узмацняцца. Клясавая барацьба ва ўсім сьвеце яшчэ больш разгарыцца.

Урадавы крызіс у Латвіі.

Ужо больш як месяц цягнецца ўрадавы крызіс у Латвіі. Папярэдні ўрад Скуэнэка злажыў свае паўнамоцтвы пасьля таго, як два паслы латвійскага сойму— расейцы па нацыянальнасьці, заявілі ўраду, што яны пераходзяць у лягер апазіцыі, бо ўрад адмовіўся задаволіць іх вымаганьні. Гэтага малога штуршка было даволі, каб ня зусім моцнае становішча ўраду Скуэнэка, які меў у сойме большасьць толькі ў 3-4 галасы, зрабілася крытычным і, хоць ураду сойм і ня выказаў недавер'я сваім галасаваньнем, аднак заставацца далей на сваім становішчы ўрад не захацеў і падаўся ў адстаўку.

Пасьля гэтага пачаўся зацяжны пэрыяд утварэньня новага ўраду.

Прэзыдэнт Латвіі даручыў утварэньне новага ўраду партыям, якія праз увесь час былі ў апазіцыі да папярэдняга ўраду.

У іх лягеры адстаўку старога ўраду сустралі з вялікай радасьцю.

Ды і ня толькі ў іх лягеры, а і ў лягеры ўсіх тых замежных дзяржаў, якія былі незадоволены савецка-латвійскімі дагаворамі аб ненападзе і гандлёвым, заключанымі з намі ўрадам Скуэнэка. У гэтым лягеры проста лічылі, што яны ня могуць выплачваць свае даўгі Амэрыцы, бо Нямеччына ў сваю чаргу ім ня плаціць. Гэта значыць, што супярэчнасьці ўнутры капіталістычнага лягеру яшчэ больш узмацняцца. Клясавая барацьба ва ўсім сьвеце яшчэ больш разгарыцца.

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрымана а 1 гадз. уночы).

ПАСТАНОВА ЦВК СССР АБ ПЕРАНЯСЕНЬНІ ПЕРАВЫБАРАЎ САВЕТАЎ НА ВОСЕНЬ 1928 ГОДУ.

МАСКВА, 5-I. З прычыны хадайніцтва паасобных саюзных рэспублік аб частковым перанясеньні выбараў саветаў на розныя тэрміны 1928 году, а таксама аб узьнікаючай адгэтуль неабходнасьці заснаваньня агульнага для всяго СССР тэрміну правядзеньня выбарчай кампаніі, які забясьпечваў-бы одначасовасьць яе, ЦВК СССР у зьмяненьне пастановы ад 19 лістапада 1927 году ўхваліў запрапанаваць ЦВК Саюзных Рэспублік перанесьці перавыбары саветаў, а таксама склік валасных (райённых), павятовых (акруговых), губэрскіх, абласных (краёвых), а таксама адпаведных ім зьездаў саветаў на восень 1928 году.

КАМУНІСТЫЧНЫ РУХ У ПРАВІНЦЫІ ХУБЭЙ.

ШАНХАЙ, 5-I. Па паведамленьню шанхайскіх газэт, у правінцыі Хубэй у масах пашыраецца камуністычны рух. Некаторыя газэты пры гэтым паведамляюць, што «камуністычныя атрады забіваюць заможных людзей».

Польшча напярэдадні выбараў.

Ці будуць дапушчаны на выбары камуністы?

Права прызнаньня і дапушчаньня на выбарах сьпіску той ці іншай партыі ці групы належыць дзяржаўнай выбарчай камісіі, у склад якой уваходзяць прадстаўнікі найбольшых соймавых груп. У гэ ай камісіі сацыялісты, сельсаюзьнікі (польскія), Вызваленьне і яўрэі будуць за дапушчэньне камуністычных сьпісаў пры выбарах у сойм. Калі-б прадстаўнікі іншых партый і былі проці дапушчэньня камуністаў на выбары, дык і тады назначанаму ўрадам старшыні камісіі віцэміністру Цару прышлося-б сваім голасам разраньць гэта пытаньне.

Падзел скуры незабітага мядзьведзя.

Пасьля доўгіх перагаворaў між паасобнымі напыянальнымі группамі, якія ўваходзяць у блёк у справе ўстанаўленьня чарговых кандыдатур на выбарных сьпісках, урэшце дасягнена паразуменьне: у Вільні і першым месцы будзе стаяць д-р Выгодзкі, на другім—ліцьвін; у Сьвянцянскай акрузе на першым месцы—ліцьвін, на другім—беларус, на трэцім—яўрэй; у Лідзкай акрузе на 1-м—беларус Сабалеўскі, на другім—яўрэй.

Сьпісы выбаршчыкаў.

Сьпісы выбаршчыкаў у сойм і сэнат ужо вывешаны. Як паведамляе «Дз. Віл», сьпісы складзены вельмі дрэнна, асабліва ў сэнат.

Выбарны камітэт Бунда.

У Вільні адчыніўся выбарны камітэт Бунда і склаўся сьпісак кандыдатур на віленскую выбарную акругу. Одначасова гэты камітэт пачаў працу і на правінцыі, мае іншыя у Глыбокім, дзе ёсьць фабрыкі і рабочыя яўрэі.

Бунд і Паалей Сыён ідуць паасобку.

Перагаворы між двумя яўрэйскімі сацыялістычнымі партыямі —Бундам і Паалей-Сыён не прывялі да іх зблёкаваньня. Ня зышліся па падзеле мейсц на выбарчых сьпісках.

Ласкі для «ўрадавых» пэпэсаў.

Б. паслянка сойму пэпэска Праусава, якая за атрыманьня мандату служыла ў Міністэрстве Працы і Грамадзкай Апекі пасьля роспуску сойму вярнулася на сваю старую пасаду, атрымала аванс і трохмесячны водпуск.

Праусава зьяўляецца гарачай прыхільцай ураду Пілсудзкага. Факт гэты служыць найлепшай ілюстрацыяй стасункаў, якія павяюць у ППС.

Рэпрэсіі проці непажаданых б. паслоў.

Проці непажаданых для сучаснага ўраду б. паслоў сойму ўрад застасоўвае толькі рэпрэсіі—пераводзіць іх на службе на горшыя пасады. Асаблівы напіск робіцца на пастаўнаў. Апошнімі днямі пераведзены з розных цэнтраў Польшчы ў захалусныя мясцовасьці пяць б. паслоў-пастаўнаў.

Зацьвярджэньне канфіскацыі.

Суд зацьвердзіў канфіскацыю № 4 радыкальнай беларускай газэты «Права Працы» за артыкул, які востра крытыкаваў урад Пілсудзкага. Трэба адзначыць, што ўсе 4 №№ гэтай газэты былі сканфіскованы.

Беспрацоўе расьце.

Паводле статыстычных даных колькасьць беспрацоўных за мінулы тыдзень узрасла ў Вільні на 134 асобы.

Справа „Грамады".

Акты абвінавачаньня па справе «Беларускай Грамады» маюць 22 томы. Яны перасланы ўжо, як паведамляе «Дз. Віл.», падпракурору Прылуцкаму, які склаў ужо акт абвінавачаньня проці 56 асоб, з якіх 4 былі паслами мінулага сойму. Акт абвінавачаньня, апісаны на машынцы, мае звыш 300 старонак. На справу пракурорская ўлада выклікае 420 сьведак.

Па надрукаваньні акту ён будзе ўручан кожнаму абвінавачанаму, якія маюць права выклікаць на суд сваіх сьведкаў.

Калі пачнецца справа, яшчэ пунктуальна невядома, але праўдападобна—у канцы лютага, і працягнецца з месяц. Справа будзе разьбірацца пры адчыненых дзьверах і толькі ў некаторых выпадках пры зачыненых. Кіраваць судовай працэдурай будзе віцэ-старшыня карнага аддзелу п. А. Аусянко.

Лёкаут с.-г. рабочых у Францыі.

ПАРЫЖ, 4-I. Перамовы між прадпрыёмцамі і бастуючымі сельска-гаспадарчымі рабочымі акругі Сіран дэпартаманту Эро ў Францыі спынены. Пасьля прыпыненьня перамоў, прадпрыёмцы абвясьцілі рабочым лёкаут.

Пад ангельскую дудку.

ВЕНА, 4-I. Водлуг дадатковых паведамленьняў з Белграду, міністр замежных спраў Марынковіч у сваім выступленьні на пасяджэньні фінансавае камісіі парляманту аб дачыненьнях між Югаславіяй і СССР між іншым заявіў: «Як вядома, савецка-ангельскія ўзаемаадносіны нездавальняючыя. Заснаваньне прыяцельскіх дачыненьняў між Югаславіяй і СССР нагершыла-б дачыненьні Югаславіі з Англіяй».

Англія пад вадою.

ЛЁНДАН, 4-I. Уздым вады ў рэчках Англіі дасяг максымальнага за апошняе дзесяцігодзьдзе ўзроўню. Да 3-га студзеня вада ў Тэмзе прыбывала кожны дзень па цалю; большая частка на лініі Тэмзы занята вадою. У Кінгстоне 5 баржаў сарваны з прычалаў патокам вады. Баржы пацягнулі за сабою яшчэ некалькі суднаў, якія знаходзіліся ніжэй на плыні рэчкі. Уся група суднаў разьбілася аб мост. 2 вёскі з жыхарствам у 2000 чалавек кожная, зусім ізаляваны ад надворнага сьвету.

Зацяжка ўрадавага крызісу ў Латвіі.

РЫГА, 4 I. Спробы Гольциана (лідэр правых сацыял-дэмакратаў, т. зв. «меншавікоў») склаць новы габінэт пакуль што ня маюць посьпеху. Перамовы ня спыняюцца.

Да перавыбараў Саветаў.

Перавыбары сустрэнем падрыхтавана.

Бабруйск. Падрыхтоўка да перавыбараў сельскіх саветаў на акрузе разгарнулася ва ўсю шырыню. У райёнах ужо складзены райённыя выбарчыя камісіі. Распачата ўжо праца па ўтварэньню сельскіх выбарчых камісій. Сельскія саветы рыхтуюць справаздачы насельніцтву. Гэтай справе аддаецца вялікая ўвага. Справаздачамі будзе абхоплена ўсё насельніцтва райёну.

Для забясьпечаньня добрых вынікаў справаздачнай працы сельсаветаў райвыканкомамі ўжо распрацованы каляндарныя пляны правядзеньня сельсавецкіх справаздач. Некаторыя сельскія выбарчыя камісіі ўжо прыступілі да складаньня сьпісаў асоб, пазбаўленых праў голасу, а сельсаветы да справаздач.

Для большага прыцягненьня сялянства да ўдзелу ў перавыбарах саветаў сетка выбарчых вучасткаў пашыраецца.

Напярэдадні перавыбараў будзе праведзена вялізарная падрыхтоўчая праца. Яна заключаецца ў правядзеньні сходаў беднаты, сходаў жанчын, сходаў батракоў, сходаў нацыянальных меншасьцяў. Так, Глускі райвыканком правядзе 20 жаночых сходаў і парады яўрэяў і палякаў. Слуцкі райён, апрача правядзеньня сходаў жанчын і інш. праводзіць райённы сход жанчын грамадзкіх работніц.

Бабруйскі райвыканком праводзіць нарады батракоў. Старобінскі райвыканком мяркуе правесьці 16 жаночых і 12 дэлегацкіх сходаў і г. д.

Лік выбарчых вучасткаў у некаторых райёнах у гэтым годзе павялічваецца супроць мінулага году на 50 проц. (Рагачэўскі райён).

Ня толькі сельскіх саветы будуць аддаваць справаздачу насельніцтву. Яе будуць рабіць і кожны сябра сельскага савету перад сваімі абірацелямі.

Справаздачная праца ў большасьці райёнаў распачалася з 1 студзеня. У некаторых-жа райёнах гэтая праца распачата і раней.

Вялікая праца праводзіцца па арганізацыі беднаты. Правядзеньне сходаў беднаты—адна з галоўных задач перавыбарнай працы.

Падрыхтоўка да перавыбараў саветаў распачата. Яна ідзе шпаркім тэмпам. Перавыбары сустрэнем добра падрыхтаванымі.

А. Дамброўскі.

Задачы сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі ў перавыбарах саветаў.

У мінулым годзе ўдзел сялянскіх таварыстваў узаемаданамогі ў падрыхтоўчай і перавыбарчай кампаніі саветаў быў слабы. Прэзыдыум ЦВК па справаздачы ЦКСТУ ў верасьні месяцы 1927 году адзначыў **слабы ўдзел камітэтаў у апошняй кампаніі ў перавыбарах саветаў.** Одначасова прэзыдыум ЦВК прапанаваў ЦКСТУ: паставіць сваёй мэтай у будучай перавыбарчай кампаніі сельсаветаў,—прыцягненьне сялянскіх таварыстваў узаемаданамо і да больш шырокага і актыўнага ўдзелу ў перавыбарчай кампаніі саветаў.

Нагэтаму, камітэты сялянскіх таварыстваў узаемаданамогі і іх сябры павінны прыняць найбольш актыўны ўдзел у наступаючай перавыбарчай кампаніі саветаў, шляхам непасрэднага ўдзельнічаньня райённых і сельскіх камітэтаў у перавыбарчых райённых, а таксама і сельскіх камісіях з аднаго боку, а з другога боку—трэба дабіцца, каб усе беднякі, бядняцкі-сялянкі—сябры сялянскай узаемаданамогі—батракі і батрачкі прысутнічалі на сходах беднаты, скліканых партыйнымі ячэйкамі. Пры гэтым наперад трэба растлумачыць, зразумела, беднякам і батракам, чаму яны абавязкова павінны прысутнічаць на гэтых сходах беднаты.

Акрамя гэтага, асаблівая ўвага павінна быць зьвернута ў надыходзячую кампанію перавыбараў саветаў на прыцягненьне сяброў сялянскай узаемаданамогі жанчын-сялянак. Прыняць усе захады да прыцягненьня гэтых сялянак на перавыбарчыя сходы, якія будуць праводзіцца на вёсцы ў час падрыхтоўчай перавыбарчай кампаніі сельсаветаў, а таксама КСУ, трэба аказваць садзейнічаньне дэлегацкім сходам жанчын, якія будуць склікацца на вёсцы па пытаньню перавыбарчай кампаніі саветаў.

Правесьці шырокую агітацыйную працу сярод сяброў сялянскай узаемаданамогі аб тым, каб яны абавязкова зьявіліся і ўдзельнічалі на справаздачна-перавыбарчых сходах і прынялі актыўны ўдзел у абгаварэньні справаздачы сельсавету і яго рэвізійнай камісіі і далі наказ уноўабранаму складу сельсавету і рэвізійнай камісіі.

Побач з гэтым КСТУ трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на ўцягненьне ў перавыбарчую кампанію нацменшасьцяў.

Прыняць усе меры на высоўваньне ў члены саветаў і рэвізійных камісій лепшых актывістых-членаў селькамітэтаў і сяброў сялянскай узаемаданамогі, батракоў, беднякоў і лепшых сярэднякоў як мужчын, таксама і жанчын, якія карыстаюцца аўтарытэтам сярод сяброў сялянскай узаемаданамогі вёскі і якія выявілі сябе на грамадзкай працы. Прычым высунутыя кандыдатуры камітэтамі сялянскіх таварыстваў узаемаданамогі павінны абгаварвацца на сходах беднаты, скліканых партыйнымі ячэйкамі, і прынятыя усе залежныя меры да іх прыняцьня.

Адзінцоў.

Працаздольнасьць сельсавету залежыць ад нас саміх.

Зьнішчым недахваты.

Набліжаецца час, калі ўся грамада—усё сялянства павінна ўскалыхнуцца. Будуць абіраца новыя сельсаветы. Надбытыя вопыты старых працаўнікоў мы павінны адсеяць і ўключыць у заданьне прыступаючых да працы новых сельсаветчыкаў. Усім абраным—сябрам сельсаветаў, мы павінны сказаць, што абралі іх не для платы, а для працы.

Мы жадаем, каб добра працавалі камісіі пры сельсаветах, але-ж гэта стрэлы ў халастую. Мы бачым, што пра камісіі ў той час толькі і гаворыцца, калі іх складаюць. Паспрабуй запытаць камісію, што ёй зроблена на працягу году,—яна ня ў моцы будзе адказаць.

Дзе самі грамадзяне ня цікавяцца працай сельсаветаў, там ня можа быць парадку. Звычайныя сябры сельсаветаў чакаюць новых перавыбараў з думкай: «А можа не абяруць»...

А калі самі выбаршчыкі ня цікавяцца працай сельсавету, дык сельсаветчыку зусім ня цяжка загінаць сваю лінію ў бок бюракратызму.

Усе павінны быць актыўнымі.

Летась мы мелі ня поўны процант выбаршчыкаў. Некаторыя размаўлялі што мы не змаглі зацікавіць сялян, як падабае і іншае. Сёлета мы павінны дабіцца, поўнага процанту ўдзелу выбаршчыкаў. Гэты дзень мы павінны абставіць, як сьвята. На вопыце мы бачым, што дзень каапэрацыі праводзіцца куды больш урачыста.

Перш-на-перш упаўнаважаным па перавыбарах ня трэба сьпяшацца, каб гэту кампанію толькі збыць з рук.

Бывае і так: калі трэба падлічыць галасы, дык высоўваюцца зацікаўленыя кандыдатуры, якія вельмі часта недалічваюць, альбо пералічваюць.

Некаторыя асобы так утваралі: падымае да верху бутэльку самагону і моцна выкрыківае.

— А, ну-ка хлапцы, хто за Якіма, падымай рукі, ня то ўгроблю.

Такіх грашкоў трэ' будзе асьцерагацца.

Астап Суніца.

с. Расасна, Аршанскай акругі.

Пясочанцы рыхтуюцца.

Пры Пясоцкім сельсавеце складзена згодна інструкцыі выбарчая камісія, перагледжаная і зацьверджаная пленумам сельсавету.

На першым пасяджэньні камісія вывучыла інструкцыю ЦВК БССР аб выбарах у саветы; перагледзела сьпіс пазбаўленых выбарчага права, прымацавала сяброў камісіі для правядзеньня перавыбараў па асобных выбарчых вучастках, склала каляндарны плян правядзеньня перавыбарчай і справаздачнай кампаніі. Акрамя гэтага, яўэйкі КП(б)Б і ЛКСМБ, абгаварыўшы пытаньне перавыбараў, паставілі сабе мэтаю шырока разгарнуць працу сярод жанчын аб уцягненьні іх у перавыбарчую кампанію, ставячы пытаньне аб значэньні перавыбараў сельсаветаў як на дэлегацкіх сходах, так і на агульных сходах жанчын.

Склікаецца агульны сход батракоў сельсавету, на якім будуць абгавораны пытаньні перавыбараў. Сходы беднаты намечана правесьці на ўсіх выбарчых вучастках перад апошнім днём перавыбараў. Гэтак сама аб значэньні перавыбараў саветаў зьмашчаюцца артыкулы ў пасьцengазеце.

Селькор Варанецкі Мікола.

М. Пясочна, Капыльскі р.

Удзел батрацтва ў перавыбарах.

На нарадзе батрацтва Клімавіцкага райёну была заслухана інфармацыя аб падрыхтоўчай працы да перавыбараў сельскіх саветаў.

Недахваты ў мінулую перавыбарчую кампанію былі такія: зьніжэньне ліку жанчын у складзе с.-с., а таксама і батрацтва.

Гэта тлумачыцца тым, што сельрабачкомы не адчуваліся на вёсцы і не вялі вялікай падрыхтоўчай працы. Батрацтву неабходна прымаць актыўны ўдзел у правядзімых сходах беднаты ў прадвыбарчай кампаніі с.-с., абгаварываючы на гэткіх кандыдатуры ў склад с.-с. з мэтай поўнай ізаляцыі кулака.

На правядзімых агульных сходах батрацтва неабходна шырока азнаёміць іх са значэньнем саветаў, як органаў дыктатуры для ўцягненьня ў іх працу шырокіх колаў батрацтва і беднаты, заўчасна трэба падаміць кожнаму аб днёх перадвыбарных і выбарчых сходаў, а таксама і месцах іхняга правядзеньня.

А. Новыш.

Клімавічы, Магілёўскай акругі.

Ня што трэба зьвярнуць увагу.

Калі прасачыць за працай камісіяў некаторых сельсаветаў, як напр., Пясоцкага і Бабаўнянскага, то мы ня знойдзем тэй зацікаўленасьці, якая павінна быць у сяброў гэтых камісій.

Чаму? А вось, чаму. Летась, калі пытаешся ў с.-с. чаму не працуюць камісіі, то атрымаеш адказ:

— Сябры камісіі заняты працаю на гаспадарцы.

А зімою? Дык таксама, як і летам. Здаецца павінны былі-б працаваць камісіі, бо час ёсьць, але-ж праца камісіяў амаль што стаіць на месцы. А прычына тут тая, што некаторыя члены камісіяў няхайна адносяцца да пасяджэньняў ды і самі сельсаветы мала зацікаўлены ў працы камісіяў: не даюць заданьняў камісіям і незаслухоўваюць іхных справаздач.

Узноў пройдзе зіма і камісіі не працуюць.

А потым уся праца с.-с. залічыцца нездавальняючай і ў дадатак, ад бязьдзейнасьці камісіяў будзе дрэнна і сялянам.

Узяўшы ўсё гэта пад увагу, трэба сельсаветам, а галоўным чынам, райвыканкомам (бо ня ўсюды добра абстаіць справа з камісіямі) зьвярнуць увагу, каб узмацніць працу камісій, бо праца камісіяў ёсьць праца самога сельсавету.

Вандроўны.

В. Восава, Капыльскі р., Меншчына.

Прыезд у Менск т.т. Ягорава, Будзёнага і Дыбенкі.

Тав. БУДЗЁНЫ—інспэктар кавалерыі Р.-С. Чырвонай армії.

Тав. ЯГОРАЎ—камандуючы Беларускім Ваенным Вокругам

Учора ў 10 з паловай гадз. раніцы прыехалі ў Менск камандуючы Беларускім Ваенным Вокругам т. Ягораў, інспэктар кавалерыі РС Чырвонай армії тав. Будзёны і начальнік забясьпечаньня войск РС Чырвонай армії тав. Дыбенка. На вакзале прыехаўшых сустракалі камандны і палітычны склад конных часьцей Менскага гарнізону.

Учора т. т. Ягорау, Будзёны і Дыбенка аглядалі часьці Менскага гарнізону, знаёмячыся з пастаноўкай вучобы, унутраным парадкам у часьцях і з умовамі жыцьця чырвонаармейцаў.

Тав. ДЫБЕНКА—начальнік забясьпечаньня войск Чырвонай армії.

У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ.

Трацкісцкай фракцыі крышка.

Камунары Масквы аб пастановах XУ партзьезду.

МАСКВА. Адбыўся сход актыву Хамоўніцкага райёну, на якім прысутнічала тысяча чалавек. У Краснапрэсьненскім, Замаскваворэцкім, Сакольніцкім і Бауманскім райёнах адбыліся сходы вчэек.

На актыве і ячэйках абмяркоўваліся вынікі XУ зьезду УсеКП. Усюды ўхвалены рэзалюцыі, у якіх адзначаецца правільнасьць пасртаноў зьезду па ўсіх пытаньнях мыжнароднае і ўнутранае палітыкі. Сходы з асаблівым здаволеньнем адзначаюць, што XУ зьезд канчаткова ліквідаваў трацкісцкую апазіцыю. Сходы заклікаюць усе ячэйкі ўважліва вывучаць пастановы зьезду і ажыцьцяўляць іх.

Віконт Гото ў Ленінградзкім савеце.

ЛЕНІНГРАД, 4-I. Японская місія на чале з віконтам Гото перш візыт у Ленінградзе зрабіла прэзыдыуму Ленінградзкага савету. У Смольным віконт Гото і сябры місіі былі прыняты старшынёю савету Камаровым. Тав. Камароў прасіў віконта Гото перадаць японскаму народу і заверыць грамадзкую думку Японіі ў шчырым жаданьні ўраду СССР жыць у прыязьні з усімі акаляючымі краінамі.

Віконт Гото пацьвердзіў факт узмацненьня культурнае і эканамічнае сувязі СССР і Японіі і выказаў гатоўнасьць спрыяць далейшаму ле разьвіцьцю.

Рэформа ўзыску прыбытковага падатку.

МАСКВА. Водлуг паведамленьня наркома фінансаў СССР т. Бруханава, прыбытковы падатак дае 285 міліёнаў руб. на дзяржаўным, а таксама і мясцовым бюджэтах. Новым палажэньнем аб падатку абмяжоўваецца прыватна-капіталістычнае накапленьне. Рабочыя і служачыя атрымліваюць шмат палёгак па сямейным становішчы. Зьнішчана сыстэма спагнаньня падатку з сумы леташняга заработку, што для рабочага было несправядліва, калі леташні заработак быў вышэй за сёлетні.

Сьмерць пісьменьніка Макіеўскага.

ЛЕНІНГРАД, 5-I. Памёр пісьменьнік і доктар Макіеўскі. Макіеўскі ў працягу некалькіх гадоў быў адным з рэдактароў «Русского богатства». Макіеўскі ўжо шмат гадоў лічыцца сябрам праўленьня літаратурнага фонду. З 90-х гадоў у яго лічыліся выдатнейшыя расейскія пісьменьнікі.

Вясновец-самародак.

ХАРКАЎ, 4-1. Прэзыдыум усеўкраінскага ЦВК па хадайніцтву НК аховы здароўя, прафэсыянальных і навуковых арганізацый, узнагародзіў ордэнам працоўнага Чырвонага Сьцягу старшага прэпаратара харкаўскага бактэрыялёгічнага інстытуту т. Ф. С. Нярубенка за яго навуковыя заслугі.

Нярубенка—селянін, маючы 20 гадоў, прыйшоў з вёскі ў Харкаў, дзе паступіў простым служачым у бактэрыялёгічны інстытут. У хуткім часе ён паказаў сябе, як знаўца, водлуг думкі мясцовых вучоных, высокае лябараторнае тэхнікі. Ён зрабіў шмат лябараторных прыладаў. Зробленыя Нярубенка экспанаты атрымалі першую прэмію на міжнароднай выстаўцы ў Дрэздэне.

Арандатар-эксплёататар.

СТАЛІН, 4-1. Акруговы суд разглядзеў справу арандатара будзёнаўскае капальні Шалюты, які затрымліваў выплату заработку рабочым і адлікаў у страхкасу. Шалюта не пакрыў запазычанасьці нават тады, калі саюз гарнякоў абвясьціў на яго капальні стачку.

Суд пастанавіў канфіскаваць і прадаць маемасьць Шалюты для задаволеньня претэнзій рабочых. Кіраўніцтва капальнямі адабрала ў Шалюты арандуемую ім капальню.

Электрычнасьць на вёску.

ЦЬВЕР, 4-I. У горадзе Весягонску, Цьверское губэрні пушчана ў ход першая буйная электрастанцыя. Станцыя дала электраэнэргію ўсяму гораду і ў бліжэйшым часе абсьвеціць шмат суседніх вёсак.

Ад'езд савецкіх каапэратараў заграніцу.

МАСКВА. 4-га студзеня старшыня праўленьня Цэнтрасаюзу Любімаў і старшыня Урадсаюзу Рабіновіч, а таксама старшыня кіраўніцтва Цэнтрасаюзу па галіні гарбатаю тав. Балтыя выехалі ў Англію, а таксама ў Францыю па гандлёвых справах.

Да пастаноў XV партзьезду.

Імпэрыялістычная істота сацыял-дэмакратыі.

Рабочая кляса ва ўсіх капіталістычных краёх яўна лявее. Шэраг сымптомаў сьведчыць, што адступленьне пралетарыяту пад напорам капіталу скончылася і што пачынаецца эпоха баявога ўздыму як у сфэры барацьбы за палепшаньне ўмоў працы, так і ў галіне абароны палітычных правоў рабочай клясы. Але палітычныя інтарэсы пралетарыяту ў сучасны момант не абмяжоўваюцца яго ўласным прававым становішчам у тым ці іншым капіталістычным краі. Словы, што кожны рабочы апроч сваёй бацькаўшчыны мае яшчэ і другую радзіму—СССР, зьяўляюцца ў нашы дні далёка ня толькі агітацыйным сказам. Пытаньнем аб абароне Савецкага Саюзу ад пагражаючага яму нападу імпэрыялістычных дзяржаў цікавіцца міжнародны пралетарыят ня ў меншай меры, як усімі іншымі жыцьцёвымі для яго пытаньнямі.

З таго часу, як Савецкі Саюз, перамогшы ўсе цяжкасьці першага перыяду грамадзянскай вайны, голаду і аднаўленьня прамысловасьці, перайшоў да будаўніцтва сацыялізму на новай эканамічнай і вытворчай аснове, рабочая кляса капіталістычных краёў у значна большай ступені, чым раней, адчула, што на ёй ляжыць абавязак абароны першага сацыялістычнага краю. Але одначасова павялічылася варожасьць сацыял дэмакратаў і рэфармістаў да СССР, хоць, баючыся рабочых мас, яны прымушаны хаваць гэтую варожасьць. Поруч з гэтым, з мэтаю паслабіць рэвалюцыйны настрой пралетарыяту, надзвычайна ўзмацнілася сацыял-дэмакратычная прапаганда клясавага супрацоўніцтва, якое, водлуг слоў рэфармістаў, толькі і здольна забясьпечыць эўрапейскаму пралетарыяту мірны пераход да сацыялізму, мінуючы рэвалюцыю і дыктатуру пралетарыяту.

Дасягненьні СССР сацыял-дэмакраты адхіляць ужо ня могуць. Але яны заяўляюць, што «расейскі шлях» зусім не абавязковы для іншых краёў і што рабочая кляса можа наступова, праз «дэмакратызацыю» фабрык і заводаў, праз прапіхненьне ў апарат кіраваньня прамысловасьцю, праз «дэмакратызацыю» парляманту і Лігі Нацый дамагчыся мірнай перамогі над буржуазіяй і абярнуць капіталістычны лад у сацыялістычны. Зразумела, праграмы гэтай ня толькі нельга выканаць, але яна і насумленная, паколькі самі сацыял-дэмакраты выразна разумеюць, што капіталізм дабрахвотна ня здасьць сваіх пазіцый і што буржуазія без барацьбы ня выпусьціць з сваіх рук такіх прылад свайго ўладаньня, як урадавы апарат, армія, паліцыя і г. д. далей. Сацыял-дэмакраты сьвядома падтрымліваюць буржуазныя ўрады і буржуазны рэжым і не адмовяць ім у сваёй дапамозе нават у тым выпадку, калі імпэрыялістычныя дзяржавы палічаць момант адпаведным для пачатку ўзброенага паскоку на СССР.

Зьвязаўшы свае інтарэсы і свой лёс з буржуазіяй і з узмацненьнем капіталістычнага ладу, сацыял-дэмакратыя і, асабліва, яе кіруючая верхавіна, самым сваім супрацоўніцтвам з пануючымі клясамі ўдзельнічае ва ўсіх іх злачынствах. Ангельскія сацыялісты падтрымліваюць усе калёніяльныя войны, якія вядзе ангельскі ўрад, адгружаюць пасылку войска ў Кітай, удзельнічаюць у працы парляманцкай камісіі, якая павінна «абгадзецельствавать» індыйскі народ без яго на тое згоды; францускія сацыялісты не перашкаджалі свайму ўраду весьці заваяваўчыя войны ў Марока і Сірыі; нямецкія сацыял-дэмакраты не хаваюць таго, што, у выпадку новай вайны, яны, як і ў 1914 годзе, станоўць на бок свайго буржуазнага ўраду.

І што-б ні казалі сацыялісты аб сваіх сымпатыях да расейскай рэвалюцыі, яны няўхільна будуць падтрымліваць узброены паскок імпэрыялістаў на СССР, бо, па іх думцы, яны абавязаны абараняць «дэмакратыю» ад «барбарскай бальшавіцкай дыктатуры» і змагацца проці рэвалюцыі, як зьявішча «шкоднага» для рабочае клясы.

Сацыял-дэмакратыя рыхтуецца да свайго ўдзелу ў агульнаімпэрыялістычным паскоку на Савецкі Саюз таксама і тым, што ўсяк выхваляе нібыта «стваротворчую» ролю Лігі Нацый і ўзяцце рабочым пасярэдзь фальшывую думку, што Ліга Нацый можа быць справядлівым судзьдзёю ў міжнародных канфліктах. Сацыялістычнае падтрыманьне, якое дасцца Лізе Нацый зьяўляецца на сутнасьці падтрыманьнем імпэрыялістычных дзяржаваў, пануючых у Лізе і рыхтуючых пры пасрэдніцтве Лігі Нацый адзіны антысавецкі фронт. Зразумела, у рашучую хвіліну міжнародны пралетарыят, насупроць прапагандзе сацыял-дэмакратычных правадыроў, здолее знайсьці правільны клясавы напрамак і паўстане на абарону Савецкага Саюзу. Але зробіць ён гэта толькі ў выніку барацьбы як з пануючымі клясамі, так і з сацыял-імпэрыялістамі, якія хаваюць сваю здраду інтэрнацыяналізму і рабочай справе пад запэцканым іх здрадніцтвам сацыялістычным сьцягам.

С. Яворскі.

Цяжкасьці гаспадарчага будаўніцтва будуць пераможаны.

Асаблівасьцю нарыяду, у які ўвайшоў наш край, зьяўляюцца буйныя разьмеры і шырокі фронт капітальнага будаўніцтва. У надыходзячую 5-цігодку прамысловасьць з электрыфікацыяй забяруць прыблізна 7,6 міліярдаў рублёў, транспарт—6,7 міліярдаў, сельская і лясная гаспадарка—1,6 міліярдаў, камунальнае кватэрнае будаўніцтва—1,3 міліярдаў, камунальныя прадпрыёмствы—1,2 міліярдаў, а усяго 18,4 міліярдаў рублёў. Зразумела, і сельская гаспадарка, і кватэрнае будаўніцтва далёка ня вычарпываюць сваёй праграмы капітальных укладаў гэтымі сумамі. Для поўнага вучоту сюды належала-б дадаць яшчэ затраты самога сялянства, прыватных асоб і каапэрацыі.

Поруч з шпаркім ростам капітальнага будаўніцтва, якое падгвае буйныя сродкі, адбываецца і шпаркі рост гаспадарчага і асабовага ўжываньня сярод мас. Між тым, у галіне грамадзкага накапленьня, як грашовага, так і натуральнага (запасы хлебныя, сыравінныя, прамысловых тавараў) на глядзецца з ачна маруднейшы рост. Вось адэтуль для бліжэйшай пяцігодкі і выплываюць найбольшыя цяжкасьці.

З чаго складаюцца гэтыя цяжкасьці? З таго, папершае, што выраб сродкаў ужываньня не пасьпявае расьці ў такой меры, як расьце попыт, ад чаго зьяўляецца таварны голад; падругое, у тым, што недахват тавараў гаспадарчага і асабовага ўжываньня мас у вёсцы выяўляецца затрыманьнем у разьвіцьці таварнасьці сялянскай гаспадаркі; патрэцце, у тым, што ў вёсцы адбываецца грашовае накапленьне, якое ня можа мець у належнай меры прадукцыйнага выкарыстаньня; пачацьвёртае, у тым, што з прычыны слабага разьвіцьця таварнасьці сельскай гаспадаркі затрымліваецца тэмп разьвіцьця вывазу, а значыць і прывозу, што затрымлівае капітальнае пераабсталяваньне і будаўніцтва.

Ці можна гэтыя цяжкасьці пераможы? Бясспрэчна, можна. Наш пяцігадовы плян народнай гаспадаркі пабудован з такім разьлікам, каб зазнаныя цяжкасьці, калі ня палкамедзіць у значнай меры перамагчы.

Гэты пяцігадовы плян, не адступаючы перад гаспадарчымі цяжкасьцямі, перш-на-перш трымае курс на наступовае павялічэньне і значнае разгортваньне капітальных прац. Толькі гэты шлях, якім ён ні быў-бы цяжкім, цьвёрда і моцна выведзе край раз назаўсёды з галоўных цяжкасьцяў, якія параджаюцца нашаю беднасьцю і слабым разьвіцьцём вытворчых сіл.

Але, праводзячы курс на капітальнае будаўніцтва, пяцігадовы плян памячае і шэраг мерапрыёмстваў для павялічэньня одначасова прадукцыі лёгкай прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, для аздараўленьня таварнага звароту, грашовага звароту і крэдыту і г. д.

Наступовы пераход на 7-мігадзінны рабочы дзень і на трохзьменную працу павінен значна ўзьняць прадукцыю прамысловасьці. Павялічаную пры гэтым патрэбу ў сыравіне прамысловасьць будзе атрымліваць за кошт пашырэньня працы на кантрактацыі, якая часткова зробіць уплыў на рост пасеваў і ўраджайнасьць, узьняўшы іх у адпаведнасьці з ростам патрэбы ў сыравіне. Апроч таго, курс прамысловасьці на зьніжэньне сабекошту прадукцыі і зьніжэньне прамысловых цэн шляхам рацыяналізацыі павінен будзе адбіцца як на ўнутраным памножэньні ў прамысловасьці, так і на ліквідацыі рыначных «ножніц», г. зн. разыходжаньні ў цэнах на прамысловыя і с.-г. тавары.

Далей, шырока разьвітай у 5-цігадовым пляне сыстэмай мер у галіне сельскай гаспадаркі будуць створаны адпаведныя ўмовы для далейшага і шпаркага разьвіцьця сялянскай гаспадаркі. Перш-на-перш вялікую ролю адыграе, як мы ўжо казалі, пераход да простага рэгуляваньня не праз каапэрацыю шляхам плянавага заказу (кантрактацыя). Буйныя работы па зямляўпарадкаваньню і паступова больш шырокае выкананьне пляну барацьбы з засухай і неўраджаямі (арашэньне, асушэньне, агрыкультурныя меры), а таксама індустрыялізацыя сельскай гаспадаркі павінны ўзьняць устойлівасьць сялянскай гаспадаркі, яе прыбытковасьць узмацніць яе сувязь з прамысловасьцю і ўсёй народнай гаспадаркай краіны.

Поруч з гэтым у пяцігадовым пляне распрацаваны мерапрыёмствы па ўцягненьні дробных зьберажэньняў і ўвязка іх з дзяржаўнай крэдытовай сыстэмай шляхам уну раных пазык, уцягненьня ўкладаў у каапэрацыю, пабудовы каапэрацыйных заводаў і г. д.

Вось той шлях, які павінен дапамагчы нашаму будаўніцтву перамагчы гаспадарчыя цяжкасьці бліжэйшага перыяду. Гэта шлях ня ўдзярнага затыканьня дзірак, ня кіданьня з боку ў бок пры часовым напружаньні, а цьвёрда намечаны шлях паступовага і плянамернага пасоўваньня наперад. Гэта—шлях рацыяналізацыі прамысловасьці і нізкіх цэн, шлях пашырэньня прамысловасьці, зьмяншэньня рабочага дню і павялічэньня зьмен; гэта шлях разьвіцьця працаёмкіх культур у вёсцы, інтэнсіфікацыі і індустрыялізацыі (перапрацоўка прадуктаў с.-гасп.) сельскай гаспадаркі; гэта шлях усямернага разьвіцьця каапэрацыі, пашырэньня дабрабыту рабочых і сялянскіх мас; гэта шлях павялічэньня значэньня сацыялістычнага сэктару гаспадаркі; і ўрэшце, шлях пашырэньня электрабудаўніцтва і забясьпечаньне гаспадаркі краіны тап

Перавыбары у каапэрацыі.

Сваякоў і растратчыкаў — па шапцы.

Хата-чытальня набіта бітком і нават частка сялян стаіць у калідоры. Нават 13 жанчын прыйшло, а гэта павіна.

Чым-жа тлумачыцца такая многалюднасьць сходу?

А тлумачыцца яна тым, што сёньня перавыбары праўленьня, якое, бадай, не загубіла наша т-ва.

Адчынілі сход.

Гоман сьціх—увага прыкавана к дакладу.

Даклад прайшоў вяла, бо дакладчык, старшыня праўленьня, не закранаў зусім хворых бакоў у працы таварыства.

Як толькі кончыўся даклад, дык пасыпаліся, як грах, пытаньні:

— Чаму не скарыстана 165 руб. з фонду беднаты на назначэньню?

— Чаму згатоўленыя ягады (брусьніцы) прадалі прыватнаму гандляру?

— Чым тлумачыцца прапажа дакументаў, чым тлумачацца заўсягдышнія растраты?

— Ці былі скаргі з боку сялян на членаў праўленьня і г. д.

Адказы на пытаньні не здаволілі прысутных упаўнаважаных, бо дакладчык ухіляўся. Але толькі скончыліся адказы на пытаньні, як разгарнуліся спрэчкі.

Члены праўленьня аж распранулися ад жары, якую пагналі і пайшчыкі і ўпаўнаважаныя. У спрэчках прыймаў удзел і інструктар Белкаапсаюзу, які ўскрыў усе гнайнікі заразы. Напрыклад, усе тавары прадаваліся вышэй расцэнкі ад 1 да 6 капеек, старшыня праўленьня заключыў сам на сябе дагавор аб прыбаўцы пэнсіі, сутачныя і камандыровачныя складаюць 476 р. і г. д.

Характэрнае на сходзе было тое, што праўленцы самі нерасварыліся. Старшыня праўленьня кажа:

— У прапажы дакументаў вінават прыказчык. А прыказчык кажа:

— Вінават старшыня праўленьня, бо ён быў у той час п'яны.

Пайшчыкі толькі ківаюць галовамі, кажучы:

— Цяпер ужо вам капут, больш вас ня выберам.

Перавыбары прайшлі бурна, бо прысутная радня старшыні праўленьня (а іх ня мала) хацела зноў яго выбраць, але не ўдалося і ніводзін стары праўленец-растратчык не прайшоў.

Пайшчыкі сьвядома далі ім рашучы адпор і выбралі людзей лепшых.

Старшынёю праўленьня прайшоў перамеьнік Мацьвеєў. Падбор праўленьня здавальняючы.

У заключным слове старшыня праўленьня Чалей у канцы сказаў:

— Я ведаю, што мяне больш ня выберуць і, цяжка ўздыхнуўшы, дабавіў: «Што-ж—нажыў і дай другому пажыць».

Новаму праўленьню трэба на гэтым лёзунгу растратчыка наставіць вруж. Трэба будзе адкінуць у бок карысныя мэты, трэба будзе сур'ёзна ўзяцца за працу і падняць аўтарытэт таварыства на такую вышыню, якім яна карысталася раней.

Пайшчык.

Зьмітравічы, Бярэзінскі райён, Меншчына.

Фонд каапэраваньня беднаты ня выкарыстаны.

Нядаўна наша Мар'іна-Горская спажывецкая каапэрацыя рабіла сваю справаздачу перад сялянамі в. Даўнава. Сяляне адзначалі дасягненьні—каапаратыў мае 4 крамы, гарбатнюю і кніжны магазын (аддзел БДВ). Няма растрат, зьніжэньне цэн праведзена поўнасьцю, скарочаны штат на 3 асобы, дастатковая нагрузка на працаўнікоў і шэраг іншых дасягненьняў.

Але былі і недахваты, як, напрыклад: нескарыстан поўнасьцю фонд каапэраваньня беднаты ў суме 802 р., —каапэравана ўсяго 230 беднякоў, яшчэ за лік фонду не каапэравана 130 беднякоў. Малы паявы капітал—усяго па 2 р. 30 к. на пайшчыка (пайшчыкаў 1600), калі каапэрацыя перайшла на 5 рублёвы пай, і іншыя недахваты.

Наогул праца прызнана здавальняючай і было пастаноўлена, каб да перавыбараў праўленьня быў скарыстаны поўнасьцю фонд на каапэраваньне беднаты і ў наступным, каб на гэтую працу адпушчалі 10 проц. ад прыбытку.

Кастусь.

В. Данілава, Пухавіцкі райён, Меншчына.

Пай павялічылі да 13 рублёў.

Адбыўся сход упаўнаважаных Чэрвенскага сельска гаспадарчага крэдытнага т-ва, на якім заслухана справаздача аб гадавой дзейнасьці і праведзены перавыбары. Да адчыненьня агульнага сходу, гэтыя пытаньні былі абгаворваны на сходзе беднаты. На сходзе як са справаздачы т-ва, так і спрэчак удзельнікаў, яскрава высьветлілася ўзмацненьне ў росьце і паленьні працы т-ва, у параўнаньні з мінулым. Напрамак існуючай працы т-ва прызналі правільным. З выдадзеных пазык на долю беднаты прыпадае —49,8 проц., на долю серадняка—50 проц. і заможніка—0,2 проц. Каапэравана беднаты—75 чал.

Адзнагалоснае павялічэньне паю да 10 р. і спэцыяльных сродкаў для сел.-гасп. складу да 3 р. выяўляе добрыя адносіны і зацікаўленасьць пайшчыкаў да сваёй установы. Старшынёй праўленьня абраны ранейшы старшыня—гэта значыць, што мінулы год ён працаваў добра.

Сьцяпан.

Чэрвенскі райён.

80 процантаў.

Справаздачная кампанія Азарыцкага сельска-гаспадарчага таварыства разгарнулася месяц таму назад. Сходамі на вёсках было ахоплена да 75 проц. пайшчыкаў, на якіх заслухоўвалася справаздача праўленьня і выбіраліся ўпаўнаважаныя.

Як мі пытаньнямі цікавіліся пайшчыкі?

Аб прадоўжаньні тэрміну па крэдытах для бядняцкай часткі вёскі пра агітэрываюе будаўніцтва, аб падрыхтоўцы і забезьпечаньні насельніцтва насеньнем да вясеньняй кампаніі, аб племянной жывёле, а таксама адзначылі значнае зьніжэньне цэн.

25-га сьнежня адбыліся перавыбары праўленьня. На сход зьявілася 80 процантаў упаўнаважаных, з якіх 60 процантаў складала беднота. На нарадзе беднаты абмяркоўваліся кандыдатуры ў склад праўленьня і рэвізійную камісію, а таксама аб павялічэньні пайнога капіталу да 13 рублёў.

Трэба адзначыць характэрны момант што ўсе кандыдатуры, высунутыя беднатой, падтрымліваліся сераднякамі, а на пытаньне павялічэньня пайнога капіталу, казалі:

— Раз беднота за павялічэньне, дык сорамна нам супярэчыць!

У спрэчках выказалася да 40 процантаў усіх прысутных.

Анучын П.

Азарыцкі р., Мазыршчына.

„Зьнішчаюць" прыватны гандаль.

У нашым сяле існуе каапэратыў з 1919 году, які за апошнія два гады значна пасунуўся ўніз. Старшыня праўленьня (ён-жа і загатоўца тавараў) добра ведае, што каапэратыў павінен абслугоўваць вясковую беднату, аб'яднаць бедняка з серадняком і зьнішчаць прыватны гандаль. На сходах ён кажа:

„Таварышы! уступайце пайшчыкамі ў каапэратыў. Толькі ён можа дапамагчы вам у падняцьні вашай гаспадаркі, толькі ён зьнішчыць гандляра!".

Гэта яго „сухая тэорыя".

Практыка яго вось якая:

Прывязе товар і самы лепшы, ходкі ў цёмным кутку перадае прыватным гандлярам.

Напрыклад: у часе кірмашоў ён перадаў тавараў гандлярам Вільнікавым на 695 руб., Лібкину на 141 руб.

Мукі пшэнічнай прыватнаму пекару адразу перадаў 6 мяшкоў. Гэта толькі відома. А колькі ён перадае, што ніхто ня ведае?

Во, гэта зьнішчэньне прыватнага гандлю! Ці ня можна яго, старшыню, на шапцы?

Пайшчык.

С. Брацьнавічы, Магілёўшчына.

ЗА СПРАШЧЭНЬНЕ СУДОВАЙ СПРАВЫ.

(Па матар'ялах Рабоча-Сялянскай інспэкцыі).

У папярэднім артыкуле (гл. «Сав. Беларусь» № 4) мы закранулі галоўным чынам пытаньне аб судовай працы. Але пакуль справа дайшла да судовай установы, яна можа праходзіць шэраг інстанцый: органы дазнаньня (міліцыя і крымінальны вышук), сьледзтва і пракуратуру. Пасьля вынясьненьня судовага прыгавору мы маем справу з папраўча-карнымі органамі (папраўчыя дамы), з пытаньнямі зьмены меры пакараньня (камісія прыватных амністый пры ЦВК, разьмеркавальныя камісіі і г. д.).

5. ПРАЦА НІЗАВОЙ ПРАКУРАТУРЫ, ОРГАНАЎ СЬЛЕДЗТВА І ДАЗНАНЬНЯ.

Праца вучастковай пракуратуры можа мець посьпех толькі тады, калі яна будзе ўвязана з шырокай грамадзкасьцю, з самадзейнасьцю ў гэтай галіне працоўных масаў.

Таму неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на **ўвязку судова-пракурорскай працы з адміністрацыйна-прававымі сэкцыямі, засноўваючы іх ня толькі пры гарсаветах, але і пры РВК і нават, па магчымасьці, пры некаторых узбуйненых сельсаветах.**

У чым, канкрэтна, можа выявіцца гэта ўвязка судова пракурорскіх органаў з савецкай грамадзкасьцю?

Неабходна практыкаваць **вынарыстаньне вопыту** суловай працы для **непасрэдных зазначэньняў дзяржаўным органам на іх недахопы** (асабліва гэта датычыцца матар'ялаў па гаспадарчых і пасадавых злачынствах), **прапрацоўка гэтых матар'ялаў і зазначэньняў сучасу праз адпаведныя сэкцыі саветаў, дапамога суду і пракуратуры ў канкрэтнай барацьбе з недахопамі дзяржаўнага апарату** (бюракратызмам, валакітай, безгаспадарлівасьцю і г. д.), у непасрэдна **жывым расьсьледваньні па скаргах, заметках з шырокім уцягненьнем ня толькі членаў саветаў, але і членаў прафсаюзаў і наогул шырокую грамадзкасьць.**

Толькі гэтым спосабам органы суду і пракуратуры адмовяцца ад наглядаючагася часамі фармальнага і чыста апаратнага характару працы.

Застаючыся галоўным вартаўніком законнасьці, пракурор не павінен распыляць сваёй увагі, павінен імкнуцца быць актыўным барацьбітом за рэвалюцыйную законасьць, а не займацца ўсякімі пытаньнямі, якія маюць да яго далёкія адносіны.

Узмацненьне працы пракуратуры павінна ісьці ў асноўных на наступных шляхох: сыстэматызацыі барацьбы з незаконамернымі пастановамі мясцовай улады, актыўнай і хуткай дапамогі працоўным пры іх скаргах на неўдасканаленасьць дзяржаўнага апарату, узмацненьне нагляду за органамі сьледзтва і дазнаньня (узмацненьне працы пракурора ў судзе).

Сьледчы апарат павінен быць поўнасьцю перададзены пракуратуры. Існуе і іншы пункт гледжаньня (некаторыя нізавыя працаўнікі), што сьледчы павінен працаваць у апараце міліцыі, (гэта датычыць раённага апарату), што гэта зьнішчыла-б раўналежнасьць між органамі сьледзтва і дазнаньня і, галоўнае, узмацніла-б кіраўніцтва апэрацыйнымі працаўнікамі міліцыі праводзячымі дазнаньне, а таксама зьнішчыла-б валакіту ў відзе перапіскі між гэтымі двума органамі.

У прапановах НК РСІ СССР намячаецца таксама ўнарадкаваньне тэрмінаў прахаджэньня спраў па органах дазнаньня, сьледзтва і пракуратуры і іншых пытаньняў узаемаадносін паміж гэтымі органамі.

На лініі органаў дазнаньня (НКУС) даюцца наступныя ўказаньні: сурова разьмежаваць функцыі ў справе дазнаньня міліцыі і крымінальнага вышуку, пасылаць асобныя патрабаваньні непасрэдна на месцы, мінуючы прамежныя інстанцыі і г. д.

Нарада працаўнікоў міліцыі і крымінальнага вышуку г. Менску (18-га сьнежня 1927 г.) высунула дадаткова наступныя цікавыя прапановы:

На ўсіх злачынствах, па якіх вінаватаму **пагражае** пазбаўленьне волі да аднаго **году і няма зазначэньняў** на асобу абвінавачанага, дазнаньне абмяжоўвацца толькі падрабязным допытам пацярпеўшага, пасьля чаго дазнаньне павінна быць спынена самымі органамі міліцыі ці крымінальнага вышуку без адсылкі іх у судовыя органы.

Зусім выразныя справы (захапленьне на месцы злачынства, прызнаньне абвінавачанага, знахаджэньне ўкрадзеных рэчаў і г. д.) ва суму да 15-20 руб. перадаць з веданьня судоў на вырашэньне адміністрацыйных органаў, якія могуць ужываць штраф (да 300 руб.), прымусовыя працы (да 3-х месяцаў) і пазбаўленьне волі (да 1-га м-ца).

Засталося на гэтай нарадзе адкрытым пытаньне аб неабходнасьці існаваньня нарсьледчага, як прамежнай інстанцыі паміж органамі дазнаньня і судом. Шэраг таварышоў выказваюцца за неабходнасьць зьнішчэньня гэтага прамежнага звяна, бо органы дазнаньня за апошнія гады ўзрасьлі і ўзмацнелі.

Наогул відаць, што гэтае пытаньне набалела і аб узаемаадносінах паміж органамі сьледзтва і дазнаньня трэба пагутарыць.

6. ВЫКАНАНЬНЕ ПРЫГАВАРАЎ І КАРНАЯ ПАЛІТЫКА.

Неабходна больш шчыльная ўвязка паміж крымінальна-судовай палітыкай судоў і лініяй папраўча-працоўных органаў. Трэба ўзьняць аўтарытэт галоўным пастаноў, вельмі частыя (са ўсіх бакоў) зьмягчэньні прыгавораў трэба ўкласьці ў пэўныя рамкі.

Папраўча-працоўныя органы павінна сьцісла выконваць прыгаворы судоў, зьмягчэньне пакараньня абдываецца з пункту гледжаньня: зьмены грамадзка-палітычных абставін ці відочнага прыстасаваньня асуджанага да працоўнага жыцьця.

Камісія прыватных амністый пры Прэзыдыуме ЦВК дзейнічае толькі ў парадку індывідуальных актаў памілаваньня.

Вярхоўнаму Суду неабходна прадаставіць права па хадайніцтву суду першай інстанцыі зьмягчаць меру пакараньня, ці поўнага вызваленьня ад пакараньня, не ўваходзячы ў Прэзыдыум ЦВК.

НКЮ БССР супроць апошняй прапановы пярэчыць.

Для большай увязкі працы судовых і папраўча-працоўных органаў, для ўнарадкаваньня справы зьмягчэньня меры пакараньня ці вызваленьня зьняволеных з папраўчых дамоў, лічыцца неабходным злучэньне існуючых двух органаў (разьмеркавальныя і нагляднальныя камісіі) і утварэньне адзінага органу—нагляднальнай камісіі пад старшынствам Нарсудзьдзі з удзелам прадстаўнікоў савету (адзін. прававой сэкцыі) і грамадзкіх арганізацый (прафсаюзаў, жанчын-делегатак і г. д.)

Гэтыя нагляднальныя камісіі павінны быць арганізаваны па ўсіх папраўчых дамох; на 50-200 зьняволеных адну камісію.

НКУС БССР лічыць, аднак, што ва ўмовах БССР арганізаваць на адзін папраўчы дом некалькі камісій немэтазгодна.

7. АГУЛЬНЫЯ АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПЫТАНЬНІ*).

Раўналежна з пытаньняні спрашчэньня тэхнікі і мэтадаў працы нізавых органаў суду, сьледзтвы і дазнаньні, у сучасны момант савецкую грамадзкасьць цікавяць і арганізацыйныя пытаньні, пытаньні пабудаваньня органаў юстыцыі. Шэраг цікавых прапаноў, зробленых т. т. Канакоціным і Зыбко на старонках «Савецкай Беларусі» (мы яшчэ, нажаль, ня маем водгукаў працаўнікоў НКЮ) блаумоўна заслугоўваюць найбольш уважлівага абмеркаваньня.

Першае пытаньне, гэта НКЮ і Вярхоўны Суд. Дзе іх пункты сутычнасьці? Што тут можна рабіць?

Сутыкаюцца гэтыя два органы ў галіне судовай інспэкцыі і судовага законадаўства. Нават калі-б тут ня было ніякай раўналежнасьці, паўстае пытаньне, ці мэтазгодна расьпыленьне функцый паміж двумя органамі, ці іх трэба перадаць у адзін. Я лічу, што нават, калі гэта не дае эканоміі грошай (а гэткая эканомія будзе), неабходна гэту справу перадаць Вярхоўнаму Суду. Апошні выпрастоўвае ўсю лінію судовых органаў, але мае справу з судовай практыкай, ён трактуе законы.

Таму неабходна, каб вопыт Вярхоўнага Суду быў поўнасьцю выкарыстан, неабходна, каб законадаўства і інструктаваньне перайшло да Вярхоўнага Суду. Ці гэта азначае ліквідацыю НКЮ? Часткова, так.

Ужо зараз намячаецца вадаразьдзел, падзяляючы НКЮ на 2 асноўныя функцыянальныя часткі —Пракуратуру і суд. НКЮ і будзе складацца з 2-х частак—Пракуратуры і суду.

А законадаўства... Кожная з гэтых частак будзе распрацоўваць законы па сваёй галіне.

Наступнае пытаньне—гэта дэцэнтралізацыя працы НКЮ.

У мінулым годзе шмат функцый было перададзена округам (заньвярджэньне нарсудзьдзяў). Неабходна працу весьці далей. Неабходна дакладна ўстанавіць (і пашырыць) правы і абавязкі акруговых і раённых працаўнікоў юстыцыі.

Некалькі слоў аб калегіі абаронцаў. Я зусім згодзен з т. т. Канакоціным і Зыбко, што пры сучасных умовах яна зьяўляецца вёсы адбіткам старога парадку, што слова «Калегія» па практыцы працы зусім аказваецца не дарэчы. Бязумоўна, неабходна кардынальным парадкам перагледзець арганізацыйныя формы і мэтады працы нашай савецкай абароны. Я высоўваю яшчэ адно пытаньне: ці патрэбна ўсебеларускае аб'яднаньне абаронцаў ці ня можна дэцэнтралізаваць кіраўніцтва калегіямі абаронцаў і прадаставіць гэту справу акруговым судом, пакінуўшы за НКЮ (Вярхоўным Судом) агульнае дырэктыўнае кіраўніцтва?

Што датычыць раўналежнасьці паміж НКЮ і КЗП СНК, дык унесеная вышэй прапанова (аб законадаўстве па лініі суду і пракуратуры) вычэрпвае гэтае пытаньне поўнасьцю.

Наш заклік да ўсіх працаўнікоў юстыцыі на падставе свайго вопыту выказацца на ўсіх закрапутых пытаньнях.

Я. Ракаў.

Папраўка.

У заўвазе да артыкулу тав. Ракава ва ўчарайшым нумары газэты дапушчана памылка. Трэба чытаць, што тав. Едэвэрал памылкова не адзначыў, што гэты праэкт дэтальна распрацован НК РСІ.

*) Усё нізэйпамянёнае зьяўляецца асабістай думкай аўтара артыкулу і ставіцца выключна ў парадку абгаварэньня.

Польскія палітзьняволеныя на мітынгу МОПР'у.

МОПРАЎЦЫ МЕНСКУ НА ВАРЦЕ.

Урачысты мітынг МОПР'у прысьвечаны спатканьню польскіх палітзьняволеных, адчыніў тав. Міроцкі—старшыня акруговага к-ту МОПР'у.

Толькі ўчора МЕНСК ДАВЕДАЎСЯ, ШТО СЮДЫ ПРЫБЫЛІ ПОЛЬСКІЯ КАТАРЖАНЕ, А СЁНЬНЯ КАСА МОПР'У ЎЖО ПАВЯЛ ЧЫЛАСЯ НА НЕКАЛЬКІ ДЗЕСЯТКАЎ СОЦЕН РУБЛЁЎ. Гэта даводзіць, што меисія МОПРаўцы на варце.

Палітзьняволеныя Польшчы, па словах таварышоў, прыбыўшых адтуль, маюць адну надзею—МОПР.

ПАДАРУНКІ АД ПОЛЬСКІХ ВЯЗЬНЯЎ

Тав. [illegible] шчак, які вітаў ад імя рэвалю[illegible] рабочых і сялян Польшчы, перадаў у прэзыдыум падарункі палітычных вязьняў Макатоўскай турмы: дынамамашыну, зробленую з хлеба (эмблема індустрыялізацыі) і прыгожы плецены кошычак—падарунак сялянам БССР.

— Я ВІТАЮ, КАЖА ТАВ. ГРЖЭЛЬШЧАК,—АД ІМЯ 6.000 ПАЛІТЫЧНЫХ ВЯЗЬНЯЎ ПОЛЬШЧЫ, У Я ІХ ЖЫВЕ НАДЗЕЯ БАЧЫЦЦА З ВАМІ Ў ПОЛЬСКАЙ ССР.

НАДЗЕІ КАМСАМОЛУ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

Вітаючы сход ад імя камсамолу Зах. Беларусі, т в. Альшэўскі сказаў:

— КАМСАМОЛ ЗАХ. БЕЛАРУСІ ПЕРАКОНАН, ШТО НЕДАЛЁКА ЧАС, КАЛІ Ў ЧЫРВОНЫМ МЕНСКУ БУДЗЕ КЛІКАН 1-ШЫ ЗЬЕЗД САВЕТАЎ ЗЛУЧАНАЙ БЕЛАРУСІ.

Мерапрыёмствы па барацьбе з беспрацоўем у 1927-28 г.

НА БАРАЦЬБУ З БЕСПРАЦОЎЕМ БУДЗЕ ВЫДАДЗЕНА 2.180.000 РУБ., ЦІ НА 34 ПРОЦ. БОЛЕЙ, ЧЫМ ЛЕТАСЬ.—НА ГРАМАДЗКІХ РАБОТАХ БУДЗЕ ЗАНЯТА ШТОДНЯ 2680 ЧАЛ. У ПРАЦЯГУ 8 МЕСЯЦАЎ. —У ПРАЦКАЛЕКТЫВЫ БУДЗЕ ЎЦЯГНУТА 2315 НОВЫХ БЕСПРАЦОЎНЫХ.—ОРГАНЫ САЦСТРАХУ ВЫПЛАЦЯЦЬ ГРАШОВУЮ ДАПАМОГУ 14800 БЕСПРАЦОЎНЫМ У СУМЕ 1.620.000 РУБ.

Агульны стан беспрацоўя.

Беспрацоўе ў БССР мае не прамысловы хэрактар:—у складзе беспрацоўных пераважнае месца займае некваліфікаваная рабочая сіла, а таксама маецца значны процант жанчын (45—50 пр.), падросткаў (12—13 проц.). Кваліфікаваныя рабочыя ў агульнай колькасьці беспрацоўных займаюць толькі 20 пр.

Гэтыя абставіны ўскладняюць работу насрадніцкіх органаў Наркампрацы, і мерапрыёмствы, якія апошнія праводзяцца, павінны поўнасьцю адпавядаць складу беспрацоўных.

На барацьбу з беспрацоўем будзе адпушчана 2180.000 рублёў.

Асыгнаваньні на барацьбу з беспрацоўем з году ў год павялічваюцца:—у 1926-27 годзе на гэта было асыгнавана 1.626.000 руб., у 1927-28 годзе намечана расходаваць 2.180.000 р., ці на 34 проц. болей, чым летась. Мерапрыёмствы, якія прадугледжваюцца пляном НК Працы на 1927-28 год, поўнасьцю адпавядаюць складу беспрацоўных і дадуць магчымасьць скарыстаць працу некваліфікаванай групы беспрацоўных, у прыватнасьці жанчын.

Асноўнымі мерапрыёмствамі ў гэтай галіне ў 1927-28 г. зьяўляюцца: арганізацыя і пашырэньне працкалектываў,—арганізацыя грамадзкіх работ і перакваліфікацыя беспрацоўных,—водпуск танных абедаў і г. д.

У працкалектывы будзе ўцягнута 2815 беспрацоўных.

У бягучым годзе ў працкалектывы мяркуецца ўцягнуць дадаткова 2815 беспрацоўных (на 1 кастрычніка 1927 г. было 7894 чалавекі). На гэта мерапрыёмства намечана адпусьціць 800 тысяч руб. Трэба сказаць, што гэты від дапамогі зьяўляецца адным з каштоўнейшых у агульнай сыстэме мерапрыёмстваў, бо, апрача таго, што значная частка беспрацоўных атрымлівае рэгулярную працоўную дапамогу, апошнія маюць магчымасьць падвысіць сваю кваліфікацыю. Разам з тым працкалектывы займаюць значнае месца ў эканоміцы і таваразвароце БССР.

На грамадзкія работы будзе асыгнавана 1 032.000 руб.

У 1927-28 г. па грамадзкія работы мяркуецца асыгнаваць 1.032.000 руб. прычым штодня ў сярэднім будзе занята 2780 беспрацоўных, галоўным чынам, некваліфікаванай рабочай сілы. У шэрагу грамадзкіх работ намячаецца: набудова затону на р. Сожы (Гомель); пляніроўка і пракладка новых вуліц у г. Віцебску; асушка забалочаных месцаў і падрыхтоўка да торфараспрацовак у Магілеве і г. д.

Правядзеньне грамадзкіх работ у папярэднія гады і вызначаныя на 1927-28 г., апрача дапамогі беспрацоўным, дало магчымасьць значна палепшыць дабрабыт гораду. Неабходна адзначыць што з агульнай сумы 1.032.000 руб. 80 пр., ці 832.000 р. пойдзе выключна на зарплату, прычым сярэдні заработак беспрацоўнага будзе складаць, 1 руб. 60 кап. у дзень для некваліфікаваных рабочых. Дзеля аказаньня дапамогі большаму ліку беспрацоўных на грамадзкіх работах будзе праводзіцца рэгулярная зьмена рабочых праз кожныя 2 месяцы.

Перакваліфікацыя беспрацоўных.

Гэта мерапрыёмства ў 1927-28 годзе значна пашыраецца: маецца на ўвазе арганізаваць курсы для падрыхтоўкі будаўнікоў на 120 чал., прычым за год будзе выпушчана агулам 360 чалавек. Будуць таксама пашыраны курсы ЦИТа шляхам арганізацыі дадатковага цэху для навучаньня такароў па металу; улетку будуць арганізаваны курсы на 200 чал. для падрыхтоўкі вясковых настаўнікаў; намячаецца таксама арганізаваць курсы на 60 чал. мадпрацаўнікоў (сярэдні пэрсанал). Апрача гэтага, НКПрацы мае на ўвазе арганізаваць вытворчую майстэрню на 50 чал. і вучнёўскія брыгады пры працкалектывах на 120 чал. падросткаў. Наогул, за год будзе ахоплена некваліфікацыяй 1300 чал. На гэты від дапамогі будзе асыгнавана каля 300.000 руб.

Натуральна-грашовая дапамога.

Наркампрацы прадугледжвае ў працягу году штодня адпускаць беспрацоўным 1615 абедаў, з іх бясплатных—260 і па 15 кап. — 1355, на што будзе асыгнавана 100.000 руб.

У Менску, Віцебску, Гомелі, Бабруйску і Магілеве будуць функцыяваць начлежныя дамы, якія дадуць прытулак штодня 400 беспрацоўным. На абсталяваньне і ўтрыманьне гэтых дамоў будзе расходавана да 35.000 руб.

Досыць значную дапамогу беспрацоўным акажуць органы сацстраху: так, у гэтым годзе будзе выдадзена **грашовая дапамога 14.800 чал.** (супроць 12.300 мінулага году), **на што прадугледжваецца 1.620.000 руб.**

У заключэньне неабходна падкрэсьліць, што ў выніку правядзеньня усіх пералічаных мерапрыёмстваў **магчыма будзе ахапіць тэй ці іншай дапамогай да 75 проц. беспрацоўных.** Гэта значыць, што сапраўды патрабуючыя дапамогі і маючыя права на дзяржаўнае забезьпячэньне гэткае атрымаюць. Неабходна таксама адзначыць, што посьпех выкананьня плану цілкам залежыць ад тэй дапамогі, якую акажуць мясцовыя арганізацыі органам наркампрацы ў правядзеньні гэтых вельмі цяжкіх і вельмі важных задач.

В. Зайцаў

Па чатырох краінах.

(Уражаньні і сапраўднасьць).

Парыскія музэі—Луўр.

Гаворачы аб Парыжы першым чынам успамінаюць Луўр, як адну з цікавейшых парыскіх культурных устаноў.

З яго імям зьвязываецца нязвычайнае начуцьцё задзіўленьня і павагі. Помніца, якою паэтычнаю вялікасьцю наліваўся ў маім выабражэньні абраз Луўру і багацьце яго зьместу. І калі дазвалила думка кратаць мажлівасьці наведаць Парыж, першым чынам яна спынялася на Луўру. Але цяжка, ня бачачы гэтае ўстановы, уявіць яе сабе.

Прынамсі ніколі мне ня прыходзіла ў голаў прадставіць Луўр гэткім, які ён ёсьць сапраўды. Свадёю вялікасьцю і багацьцем ён апярэдзіў усе нашы чаканьні.

Луўр знаходзіцца на правым беразе Сэны. Наш готэль мясьціўся ад яго на адгоне пятнаццаці хвілін хады.

Ужо ў першы дзень прыезду, вынаўшы паспацыраваць па вуліцах Парыжу і ачуўшыся на ўзьбярэжнай Сэны, мы зьвярнулі увагу на вагромністы надзвычайнае прыгожасьці будынак-палац, які мо' на паўкілёмэтра цягнецца між Сэны, упіраючыся адным канцом у сад. На выгляду здалёк будынак Луўру нагадвае тую ці іншую ўрадавую ўстанову, але форма і багацьце здэтройкі выгадна вылучае яго ад заўсёдашняй мёртвасьці казённых будынкаў.

Самі мы і не падумалі, што гэты будынак ёсьць Луўр. Наш гід-перакладчык паведаміў нам аб гэтым, калі мы ачуліся перад вагромнымі гмахамі Зьўнага некалі Цюльерыйскага палацу французскіх каралёў. Палац пабудаваны формаю літары П з адным дадатным пад верхняю ператочкаю гмахам. Між бакавымі корпусамі палацу ляжыць вялічэзны плац—палацы—з клюмбамі красак, дэкарацыйнай расьлінасьцю, помнікамі і статуямі. З плацам мяжуе Цюльерыйскі сад, за якім пачынаецца адна з прыгажэйшых вуліц Парыжу—Эляісейскія поля.

Весь вагромністы трохпавярховы палац, за выключэньнем аднаго бакавога корпусу заняты пад вядомы ў сьвеце музэй.

Знадворку, аднак, цяжка ўявіць сабе багацьце, якое зьмешчана ў Луўру. З трапяткаю настарожлівасьцю, запланіўшы па два франкі за ўваход, мы пераступілі парог Луўрскага музэю.

Незьмярныя вокам залі ніжняга паверху разьляглася перад намі, здзіўляючы нашы погляды ва ўсе бакі. У ніжнім паверху скульптурны аддзел. Пачынаючы ад недагэльных каменных плітак да колесальных сфінксаў і саркофагаў Эгіпту, вы тут бачыце надзвычайную колькасьць грэцкае, рымскае старасьвецкае школы і пазьнейшых часоў скульптурныя творы: амуры, вазкі, Зэўсы, Афродыты, філёсафы. Няма фізычнае магчымасьці спыніцца ня толькі на ўсіх рэчах, але і на выдатнейшых з іх і на тых арыгіналах, якіх апроч Луўру—нідзе няма.

Мы сьпешна прабягаем залю за залямі, імкнучыся хоць з большага абгледзіць гэтыя помнікі культуры. А наш гід-перакладчык раз-у-раз дапамінае, што, аглядаючы гэткім тэмпам, нам і за тыдзень не агледзець Луўру. Тады мы паскараем тэмп разгляду. Накіроўваем у пакой, дзе зьмешчаны выдатныя творы Мікель Анджэло і статуя Вэнэры Мілоскай.

Вось мы перад фігурамі гэніяльнага італьянскага мастака. Накіроўваем пагляды і апіваемся выразам твару, натужнасьцю мускулаў і сілаю суму Мікель Анджэлёўскага раба. На суседству, у доўгай сумнаватай салі, на фоне цёмнае сьцяны акрэсьлянецца прыгожая постаць без аднае рукі Вэнэры Мілоскай. Вакола яе цэлы букет статуй іншых багінь, у хітонах і аголеных, здаецца шмат прыгажэйшых з твару, але мацней усіх прыцягае да сабе Вэнэра Мілоская. З усіх канцоў скульптурнага аддзяленьня музэю гледачы накіроўваюць да яе і пільна, з замілаваньнем азіраюць грэцкую багіню з усіх бакоў. Некаторыя на дзесяці хвілін не адніманюць ад яе ваччу, садзяцца і любуюцца, заахвочваючы другіх.

М. Зарэцкі, відаць, ня зразу вынаходзіць усе тыя асаблівасьці вядомага твору невядомага мастака. Ён ходзіць вакола багіні, пераказвае нам словы Г. Гэйне і нясьмела засьведчывае лёгкае расчараваньне. Аднак, ня прызнаньне мастацкасьці рэчы, аб якой яму і кожнаму з нас даводзілася многа чуць, было бы не дасканалым вывучэньнем твору. І абудзы Міхасі забываюць аб усім і аба мне з перакладчыкам і неадгінна то з блізку, то з воддаль сачаць на Вэнэру Мілоскую.

Мо хвілін праз дваццаць яны знаходзяць нас у багатай амфіладзе пакояў, адведзеных пад этнаграфію. «Ну, і дзіўная-ж рэч, гэта Вэнэра Мілоская!—кажуць яны, маршам прабягаючы паўз багацейшыя колекцыі амулетаў, тканін, пляценьняў, гліняных і керамічных вырабаў, спасьцей і ўбераў усіх народаў усяго сьвету. Я не пратэстую гэткаму паскараному агляду, напершае, добра разумеючы, што ўсяго не запамятуем, надругое, таму, што не бяднейшыя зьбёры этнаграфічных рэчаў мне давялося бачыць у багата абсталёваным этнаграфічным музэі ў Берліне. Этнаграфічнае аддзяленьне музэю, бязумоўна, само-па-сабе не зьяўляецца чымсьці асаблівым ад іншых музэяў гэткага роду. Хіба толькі ў Луўру само п мяшканьне і дасканаласьць абсталяваньня некалькі падбольшваюць эфэкт...

Мы пераходзім у шыкоўную, жывапісную салю музэю, вабраную прыгожаю лепкаю, багатымі ліхтарнямі (люстрамі), малахітавымі камінамі,—якая адведзена пад рэшткі каралеўскіх рэліквій. У зэркальных вітрынах пасярэдзіне салі і каля сьцен выглядаюць даражэйшыя цацкі і падаркі каралеўскіх родаў, знайшоўшых сваю гібель у полымі Вялікае Французкае Рэвалюцыі. Паміж багацейшых інкрустацый, разьвешаных гобэленаў і смугных паласатых Людовікаў і Карлаў, кідаюцца ў вочы дзесяткі розных гадзіньнікаў, табакерак, шкатулак, мадэлей касьцёлікаў, цэркваў. Але знатнейшымі экспанатамі гэтага аддзелу зьяўляюцца каралеўскія кароны, усыпаныя брыльянтамі, алмазамі, рубінамі, і знатны зьвыш стокаратавы брыльлянт. Апошні ня менш, калі ня болей за ўсё, прыцягае да сабе ўвагу гледачоў, якія, напэўна, прамяняілі бы на яго ня толькі Вэнэру Мілоскую, а і Джаконду Леанардо-да-Вінчы, Ведаючы добра, што лёс знатнага брыльянту ў любы момант можа ўпадобіцца да лёсу Джаконды, *) кіраўніцтва Луўрам паставіла за ім узмоцнены нагляд.

Лепш далей ад гэтае спакусы! Тутжа, побач, пачынаецца карцінная галярэя. Вось, бач, галоўнае, што адлічае Луўр ад іншых музэяў і куды болей усяго цягне нас... Я не агледжваюся, як Міхасі гінуць ад яне, хаваючыся за цяжкімі залочанымі дзьвярыма ў карцінныя салі. Сьпяшу за імі і на першым кроку ад дзьвярэй мы спыняемся аналоченыя колесальнымі, мо на паўвярсты салямі карцінные галярэі. Тысячы вобразаў са сьцен не даюць нам апамятацца, адкуль і што пачаць іх разгляд і калі гэты разгляд нагчыма скончыць. Міхасі ў нерашучасьці пачаць разгляд, губячыся ў часе яго канца. «А яшчэ некалькі саляў з вобразамі мы абмінулі, калі ішлі ў этнаграфічнае аддзяленьне», кажуць яны. А гід-перакладчык дадае ад сябе, што карцінная галярэя мае некалькі бакавых пакояў і надаімаецца на трэці этаж. М. Чарот капаецца за голаў, але мы далей ня думаем і пачынаем разгляд ад царкоўнае жывапісі першых вякоў хрысьціянства і паступова пераходзім да эпохі рэнэсанса. Нарадкам праходзяць паміж нашага ваччу вялікарэчыстыя палотны і дробныя [illegible]альяніцаў, галяндцаў, фламандцаў, французаў — (Рэмбранд, Веласкец, Б. Мурэ

Беларускі студэнт.

Балючыя месцы ў студэнцкім жыцьці.

(У парадку абгаварэньня).

У сувязі з ростам дзяржаўнай прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, падрыхтоўка новых кадраў працаўнікоў на фронце асьветы адыгрывае надзвычайна важную ролю. На Беларусі гэту задачу выконвае БДУ, які выпускае кожны год, у лік іншых спэцыялістаў, новых асьветнікаў. Праз іх КП(б)Б і савецкая ўлада ўздымае культурны ўзровень рабочых і сялян нашай рэспублікі.

Трэба заўсёды памятаць, што ў Савецкім Саюзе інтарэсы навукі гарманічна злучаюцца з інтарэсамі працы. А гэта ставіць перад студэнтам пэдфаку задачу больш сур'ёзна адносіцца да сваёй вучобы.

Сацыяльна-гістарычнае аддзяленьне пэдфаку рыхтуе працаўнікоў на ідэалёгічным фронце—настаўнікаў - грамадазнаўцаў. Каб скончыць гэта аддзяленьне, студэнт павінен мець ад 45 да 55 запісаў (залікаў), прычым да гэтага часу залікі прымаліся два разы ў год, што адводзіцца на месяц на заканчэньне сэсіі. Рэдкі часта некаторыя з навуковых працаўнікоў бываюць у адъезьдзе як раз у часе залікавае сэсіі, і тады студэнту дабаўляецца залікавай тарачкі на наступны месяц. У сярэднім кожны год студэнту трэба здаць 12—13 залікаў.

Паўстае пытаньне: ці можа студэнт пры ўсіх уважлівых адносінах да заняткаў замацаваць у памяці поўнасьцю тое, што ён праходзіць ва ўнівэрсытэце і выйсьці зусім прыгодным да работы на сваёй спэцыяльнасьці па сканчэньні курсу?

Можа быць толькі адзін адказ: не, бо ў працэсу навуковага году студэнт павінен акуратна наведваць усе лекцыі, рыхтавацца да сэмінарскіх заняткаў і выконваць які-небудзь грамадзкі абавязак. Ні для каго таксама не сакрэт, што навуковую дысцыпліну можна вывучыць не па 1—2 падручніках, як гэта практыкуецца ў нас на пэдфаку, а трэба прапрацаваць ня менш 7-8 грунтоўных кніг. А гэтага можна дасягнуць толькі пры зьнішчэньні існуючай многапрадметнасьці, калі за ўвесь час прабываньня на пэдфак, студэнт будзе вывучаць ня больш 20-ці дысцыплін, з якіх 10-12, а то і 15 можна будзе прапрацоўваць у сэмінарыях. «Лепш менш, ды лепш».

Пры гэтакай пастаноўцы навучальнай працы студэнт упэўнена прыступіць да настаўніцкай дзейнасьці, і ня будзе дрэнных водзываў з месц аб пэдфакаўцах (хоць іх і мала). Прафэсар будзе ведаць кожнага студэнта і будзе мець права патрабаваць ад яго больш глыбокіх, больш грунтоўных, ведаў па прачытанай ім дысцыпліне. Ня будзе таксама і таго, што настаўнік, скончыўшы пэдфак, працуе у малодшым канцэнтры сяміголкі, а разам з тым аднадзе налажэньне аб дзяржаўных экзаменах пры выпуску.

Выпускнік дзярж. экзамену не баіцца—ён яго вытрымае, але гэта ня дасьць магчымасьці вывучыць выпускніка.

Мы гэта ведаем з вопыту мінулых гадоў.

Нам неабходна паставіць справу так, каб студэнт у мурох унівэрсытэту навучыўся быць актыўным, ініцыятарам і дасьледчыкам навучальнай працы, каб атрыманыя веды запраўды замацаваліся. Тады можна будзе паставіць перад выпускніком-студэнтам задачу аб абароне самастойнай дыплёмнай работы, а гэта дасьць поўную магчымасьць высьветліць асобу выпускніка.

За дыплёмную работу, а не экзамен! Гэта—не сямігодка, а Унівэрсытэт!

Нозік Л.

Патрэбна сувязь.

Вышэйшыя навучальныя ўстановы Беларусі, ня гледзячы на кароткі тэрмін існаваньня, выпусьцілі з сваіх муроў шэраг спэцыялістаў на розных галінах культурнага і гаспадарчага будаўніцтва. Студэнты, скончыўшыя выш. нав. установы і тэхнікумы, накіраваны для працы ў розныя куткі нашай краіны: урача, агранома, настаўніка, экаваміста, лесавода, юрыста, тэхніка, скончыўшага Беларускіх ВНУ, магчыма зараз сустрэць амаль у кожным раёне БССР. Студэнты і навуковыя працаўнікі ВНУ гатовы выпускамі чырвоных спэцыялістых пачалі апанаваць працоўным масам вёскалі, якія яны выдалі пры заснаваньні ВНУ і тыя асігнаваньні вялікіх сродкаў, якія робіцца ўрадам працоўных для будаўніцтва савецкай выш-школы.

Аднак, у гэтай агульнай і адказнай працы ёсьць і шэраг недахопаў: кваліфікацыя выпускнікаў ВНУ спэцыялістых яшчэ не на належнай вышыні, і пытаньне падняць ды акадэмічнай пасьпяховасьці, а разам з тым і паляпшэньня якасьці ведаў студэнтаў, скончыўшых навучальныя установы, стаіць на першым пляне.

Побач з шэрагам мерапрыёмстваў у гэтай галіне трэба падумаць і аб сувязі скончыўшых з сваёй навуч. установай. Сувязь паміж студэнтаў з сваёй выш. нав. установай можа і павінна некаторым чынам дапамагчы ім у працы на месцы—з аднаго боку, а з другога—дапаможа выявіць тыя недахопы ў пастаноўцы вучэбнай справы на падрыхтоўцы новых чырвоных спэцыялістых, а асабліва відаць таму, хто сам прайшоў гэты курс вучобы і ў сучасны момант прысасоўвае атрыманыя веды ў штодзённым жыцьці на сацыялістычным будаўніцтве.

Да гэтага часу студэнцкія арганізацыі і праўленьні навучальных установаў Беларусі мала зрабілі ў гэтым напрамку, і трэба вітаць пачын прафкому саюзу працаўсьветы пэдфаку БДУ, які ў гэтых адносінах нешта пачаў рабіць. У свой час (1925 год) пры Пэдфаку БДУ было арганізавана дэканатам і прафкомам для лепшага наладжваньня сувязі са скончыўшымі спэцыяльнае бюро сувязі, але яно будучы непрацаздольным з прычыны несадаведнага складу, працы не разгарнула і прымушана было памерці і зараз мы маем імкненьне да таго, каб ажывіць гэта бюро, што бязумоўна неабходна зрабіць. Асабліваё значэньне сувязь ВНУ са скончыўшымі мае для Пэдфаку і пэдтэхнікумаў, бо ў справе падрыхтоўкі настаўнікаў у нас яшчэ ня ўсё ў парадку.

Трэба зрабіць, каб студэнт, скончыўшы ВНУ, не парываў з ёю сувязі, каб яна для яго была і на практычнай працы крыніцай ведаў, дапамагала мэтадычнымі парадамі, прымала ўдзел у выраўнаньні тых ці іншых цяжкасьцяў. Скончыўшы-ж адначасова будуць вельмі карысны для сувязі ВН Установы з шырокімі масамі, для выяўленьня іх запатрабаваньняў да навуч. установы, для выпраўленьня тых памылак, якія ёсьць у вучэбных планах.

Дзеля гэтага неабходна ўтварыць сталае бюро ці камісію сувязі са скончыўшымі навучальныя ўстановы. У гэтай працы, апрача праўленьняў ВНУ, павінны прыняць актыўны ўдзел і студэнцкія арганізацыі. Аб неабходнасьці сувязі сьведчыць шэраг лістоў, якія паступаюць ад скончыўшых ВНУ, у прыватнасьці шмат лістоў былых студэнтаў пэдфаку БДУ.

Т. Львовіч.

Экскурсійнае.

Штогод студэнцкія арганізацыі ў часе летніх і зімовых вакацый арганізуюць далёкія экскурсіі, у нашы найбуйнейшыя палітычныя, эканамічныя, культурныя і навуковыя асяродкі. Шмат гэтаму дапамагае льготны праезд на чугунцы, асабліва літары для бясплатнага праезду, бо сродкі экскурсантаў-стыпендыянтаў вельмі абмяжованы. Некаторыя вышэйшыя навучальныя установы маюць па кантарысу на экскурсійную справу невялічкія асыгнаваньні, пераважная-ж большасьць сродкаў на гэту справу паступае ў выніку самадзейнасьці студэнтаў, іх арганізацый і з асабістай эканомі студэнтам стыпендыяльных капеек.

У бягучым годзе справа падрыхтоўкі да экскурсій была свячасова разгорнута студэнцкімі арганізацыямі амаль па ўсіх навучальных установах, у выніку чаго прадстаўнікі усіх іх набываюць на экскурсіі.

Экскурсійныя групы, галоўным чынам, накіроўваюцца ў Маскву і Ленінград, асабліва ў апошні.

У Маскве экскурсанты маюць на мэце азнаёміцца з Трэцьякоўскай галярэяй, музэем Рэвалюцыі, музэем Леніна, з буйнейшымі фабрыкамі, спэцыяльнымі навуковымі ўстановамі; у Ленінградзе—з буйнай прамысловасьцю, гандлёвым партом, пабываюць у Петрапаўлаўскай крэпасьці—былой „расейскай бастыліі", Смольным, Эрмітажы, музэі Рэвалюцыі і навуковых установах Ленінграду.

У сярэднім экскурсанты прабудуць па 7-8 дзён. У большасьці экскурсіі маюць культурна-асьветны характар, аднак у гэтым годзе ім часткова прыдасцца па магчымасьці і спэцыяльны ўхіл. З некаторымі экскурсійнымі групамі, у якасьці кіраўнікоў, едуць вылучаныя праўленьнем навучальных установаў навуковыя працаўнікі, што, бязумоўна, адабр'ецца на паглыбленьні акадэмічнага боку экскурсій. Шкода толькі, што ня ўсе навучальныя ўстановы пакланапіяся гэта зрабіць.

Пры Наркамасьветы і цэнтральным бюро пралетэстуду ЦСПСБ была ўтворана часовая камісія, якая падрыхтавала і наогул кіравала гэтай справай. Трэба зазначыць, што ў гэтым годзе студэнцкія арганізацыі добра выкарысталі вопыт мінулых экскурсій для ліквідаваньня непармальнасьцяў у экскурсійнай справе.

Студэнцкая маса, за малымі выключэньнямі, спаткала экскурсійны час падрыхтаванай і таму экскурсійная хваля ахапіла значную частку студэнцтва.

1-2 студэнта з усіх вышэйшых навучальных устаноў, тэхнікумаў і рабфакаў БССР выехала ў экскурсіі каля 800 беларускіх студэнтаў.

Студэнт Г-ч.

Лябараторыі падвышэньня ўраджаяў.

ДАСЬЛЕДЧА - ВОПЫТНЫЯ СТАНЦЫІ.

Праблема падвышэньня ўраджаяў і выбару карысных і ўраджайных сартоў збожжа, траў і кораньплодаў зьяўляецца зараз у БССР аб'ектам самага дакладнага вывучэньня. У веданьні Наркамзему БССР знаходзіцца 7 вопытна-дасьледчых станцый: Горацкая, Віцебская і Турская—па сельскай гаспадарцы, Магілеўская станцыя на вывучэньні і папярэдні лекавых расьлін, Менская машыпаспробная і Заблацкая балотная.

На дасьледчую і вопытную справу на станцыях у 1926-27 г. было выдана каля 110 тысяч руб., а на 1927-28 г. на плянуе вызначана каля 200 тысяч руб.

Чыму трацяцца такія вялікія грошы на дасьледчую справу? А таму, што ўраджай нашай сялянскай гаспадаркі вельмі нізкі. Напрыклад, ураджай жыта складае 50 пуд. з гектару, аўса—40 п. і г. д. Вопыты дасьледчых станцый паказалі, што пры правільнай пастаноўцы сельскай гаспадаркі тая самая глеба дае значна большы ўраджай. Напрыклад, вышэйшы ўраджай жыта станцыі даюць 158 п. з гэкт., а сярэдні сялянскі—толькі 48 пуд., аўса станцыі даюць 115 пуд., у сялянскай гаспадарцы толькі 40 пуд. і г. д.

СЕЛЕКЦЫЙНА - НАСЕННАВОДНАЯ СПРАВА.

Селекцыйна-насеннаводная справа, г. з. падбор найбольш стойкіх і ўраджайных гатункаў расьлін праводзіцца ў нас на Віцебскай і Турскай дасьледчых станцыях. На Турскай станцыі закладзен выхавальнік лугавых траў на плошчы ў 22 гэкт. Вывучэньне пакуль што праводзіцца над жытам, пшаніцай-авівеяй, ячменем, аўсом, каляю, лёнам, лугавымі травамі і кораньплодамі.

СОРТАСПРАБАВАНЬНЕ.

У БССР пашыраны шматлікія гатункі жыта, бульбы, пшаніцы і інш. Зярняткі жыта бываюць вельмі дробныя, з малымі каласамі і больш буйнымі каласамі і зярнём. Гэта-ж самае можна сказаць і адносна іншых гатункаў пшаніцы-яркі, аўса, бульбы, ячменю і інш.

Вопыты над вывучэньнем найбольш карысных гатункаў праводзяцца ў 7 пунктах. Тут вопыты праводзяцца над 140 рознымі гатункамі аўса, жыта, ячменю, бульбы, турнэпсу, лёну, бручкі і канюшыны.

ЛЕКАВЫЯ РАСЬЛІНЫ.

У мінулым годзе на Магілеўскай дасьледчай станцыі было занята пад лекавымі расьлінамі 150 гэкт. Галоўным чынам, тут разводзяць: валер'ян, беладону, напярсьцянку, шалфей, мяту, розныя рамашкі, дурман і інш. Апрача разьвядзеньня лекавых расьлін, якія растуць у дзікім становішчы на абшарах БССР, робіцца спроба разводзіць лекавыя расьліны больш цёплага клімату. Сёлета станцыя сабрала значную колькасьць насеньня лекавых расьлін, якія будуць пашыраны і сярод сялянства.

СЯЛЯНЕ-ДАСЬЛЕДЧЫКІ.

Усе гэтыя мерапрыёмствы будуць пашырацца сярод сялянства ў першую чаргу праз арганізацыю найбольш перадавых сялян, сялян-дасьледчыкаў, якія на сваіх палёх праводзяць тыя ці іншыя вопыты над угнаеньнем, сортаспрабаваньнем, тэрмінамі пасеву, часу ворыва і г. д.

Інстытут сялян-дасьледчыкаў існуе ўжо 2 гады. Легась у гэту арганізацыю ўваходзілі 42 дасьледчыкі, сёлета іх налічваецца звыш 430.

М. К.

На Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

МЭЛІАРАЦЫЯ Ў ВІЦЕБШЧЫНЕ.

Віцебск, 5-1. Па акрузе зараз налічваецца 138 мэліарацыйных таварыстваў. Таварыствы налічваюць 6770 членаў і працуюць на плошчы ў 31.971 гэктар. Зараз адбываюцца па акрузе перавыбары мэліарацыйных таварыстваў. Шэраг таварыстваў ужо перавыбраны. Перавыбары скончацца 15 студзеня. Мэліарацыйныя таварыствы, якія сябе не апраўдываюць, будуць ліквідаваны. Наадварот, працаздольныя таварыствы атрымаюць памацаваньне.

РОСТ РАБОЧАЙ КААПЭРАЦЫІ.

Полацак, 5-1. За мінулы год лік найшчыкаў у Полацкім ЦРК даў прыросту на 70,9 проц. Па асобных групах найбольшы процант далі чырвонаармейцы (348 проц.), чыгуначнікі (121 проц.) і саматужнікі (63,6 проц.) Наявы капітал за гэты час павялічыўся звыш чым на 100 процантаў.

СЯЛЯНЕ САМІ АРГАНІЗАВАЛІ ПАЖАРНУЮ ДРУЖЫНУ.

Талочын, 5-1. Сяляне вёскі Таласкоўшчына самі арганізавалі пажарную дружыну. На сабраньні па самаабкладаньню сродкі купілі неабходныя супрацьпажарныя прылады.

400 ЧАЛАВЕК ЗВОЛЕНА АД КАРЫ.

Бабруйск, 5-1. Па 7 раёнах акругі ў раймілісіях па амністыі ліквідавана 265 спраў на злачынству. Па гэтых справах зволена звыш 400 чалавек ад прыцягненьня іх да адказнасьці.

БЕСПРАЦОЎЕ СЯРОД МОЛАДЗІ.

Полацак, 5-1. Па юнацкай сэкцыі біржы працы лічыцца зараз 287 беспрацоўных, з якіх 250 сяброў прафсаюзаў. Амаль уся гэта моладзь ня мае кваліфікацыі, 64 проц. зьяўляюцца чорнарабочымі. За мінулы м-ц біржа працы праз юнсэкцыю паслала на працу 160 юнакоў.

ДА АДКАЗНАСЬЦІ ЗА НЕПЛАЦЁЖ ПАДАТКУ.

Сіроціна, 5-1. Сіроцінскі райвыканком прыцягнуў да адказнасьці 10 грамадзян за няўплату ў тэрмін другой часткі сельска-гаспадарчага падатку. Народны суд 15 вучастку прыгаварыў усіх неплацельшчыкаў да штрафу на суму ад 8 да 25 рублёў.

ПАШЫРЭНЬНЕ СЕТКІ С.-ГАСП. КРЭДЫТНЫХ ТАВАРЫСТВАЎ.

Гомель, 5-1. У бягучым годзе нізавая сетка сельска-гаспадарчых таварыстваў будзе пашырана на 14 новых т-стваў. Ужо канчаткова арганізаваны 2 новыя т-вы.

КАМПАНІЯ ПА ПЕРАВЫБАРАХ КААПЭРАЦЫІ ПРАХОДЗІЦЬ АКТЫЎНА.

Камарына, 4-1. У Камарынскім раёне заканчваюцца перавыбары ў спажывецкай каапэрацыі. Некаторыя спажывецкія таварыствы, якія знаходзяцца блізка адно каля другога, зьліты, што дасьць значнае ўтаненьне сабекаштоўнасьці тавараў. Перавыбары праўленьняў прайшлі ажыўлёна і дзелавіта. У новыя праўленьні праходзяць беднякі і лепшая частка серадняцтва.

53.000 РУБ. НА БУДАЎНІЦТВА СЯМЁХГОДКІ.

Барысаў, 5-1. У цэнтры рабочага гарадку Н.-Барысава будуецца будынак сямёхгодкі. У 1926-27 бюджэтным годзе на будаўніцтва школы было расходавана 18.000 руб. У гэтым годзе на працяг будаўніцтва адпускаецца яшчэ 35.000 руб.

АБЛАВЫ НА ВАЎКОЎ.

Віцебск, 5-1. У Віцебшчыне за апошнія часы наглядаюцца частыя напады ваўкоў. Акруговы саюз паляўнічых арганізуе вялікія аблавы на ваўкоў у Бешанковіцкім, Гарадоцкім, Сіроцінскім і Сураскім раёнах. Падрыхтаваньні да аблаваў ужо скончаны.

Хроніка.

Разьвіцьцё экспорту леса-матар'ялаў.

Пытаньне экспорту лесу вельмі сур'ёзнае і важнае; асабліва гэта пытаньне паўстае са ўсёй рашучасьцю, калі да БССР была далучана Гомельшчына. Гомельскі раён багаты лесам і яшчэ ў даваенныя часы даваў шмат лесаматар'ялаў на экспорт.

Управа Дзяржгандлю, як адзін з асноўных экспардёраў БССР, у апошні час прыняла рад важных рашэньняў адносна экспорту лесаматар'ялаў. Для большага посьпеху ў працы Управа Дзяржгандлю БССР заключыла дагавор з Управай Дзяржгандлю РСФСР на супольную заготоўку і перапрацоўку экспортнага лесу. Ужо ідзе інтэнсыўная падрыхтоўчая работа.

У першую чаргу ў леса-экспорце прыме ўдзел Гомельскі раён, пасьля Віцебскі і Полацкі, якія таксама маюць шмат экспортных лесаматар'ялаў. Нар. Кам. Гандлю з свайго боку павінен аказаць усялякую дапамогу ў разьвіцьці і пашырэньні экспорту лесаматар'ялаў.

Вынікі будаўніцтва на дарогах сельскага значэньня.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам ст. інспэктар дарожнага будаўніцтва пры НКУС т. Паўлаў паведаміў аб тым, якое будаўніцтва праведзена ў 1926-27 годзе на дарогах сельскага значэньня.

У 1926 годзе ўрадам БССР быў выданы закон, які даў магчымасьць вясковаму насельніцтву прымаць удзел у шляхавым будаўніцтве пры дапамозе тэхнічнага апарату дзяржавы. Ня гледзячы на нядаўняе выданьне гэтага закону, ужо ёсьць значныя дасягненьні ў сэнсе ўдзелу насельніцтва ў шляхавым будаўніцтве.

У мінулым будаўнічым сэзоне работы па шляхавым будаўніцтве сельскага значэньня праводзіліся ў 89 раёнах рэспублікі з удзелам 1015 сельсаветаў. Самім насельніцтвам зроблена: пабудавана мастоў —4 141 (11884 паг. мэтраў); адрамантавана мастоў—3440 (13223 паг. мэтраў); папраўлены дарогі на працягу 536 кілёмэтраў. Дапамога з боку дзяржавы выявілася ў водпуску 28.103 руб. грашыма і 27.764 пяёў лесу.

Асабліва значнае будаўніцтва на дарогах сельскага значэньня правёў Узьдзенскі РВК і вёскі Менскай акругі—Цярабель, Забалацьце, Магільна і Сяргеевічы,—пры чым апошняя вёска вымасьціла вуліцу на працягу 3.600 кв. мэтраў.

Райвыканкомам і сельсаветам належыць шырэй папулярызаваць справу шляхавага будаўніцтва і большага ўцягненьня ў яго насельніцтва.

Пад знакам актыўнасьці.

У сакавіку месяцы 1927 году пачало сваю працу Менскае Прымясцовае Спажывецкае Таварыства «Земляроб», якое абслугоўвае пайшчыкаў - сялян прымясцовых акраін.

Зараз, пасьля 6 месяцаў працы, ёсьць шмат дасягненьняў.

Зараз у прыбыткова-гандлёвым звароце таварыства больш як 8.000 р.; за кошт памяншэньня накладных і гандлёвых выдаткаў зьніжаны розьнічныя цэны. За шэсьць месяцаў гандлёвы зварот таварыства ўзрос да 373.000 руб.

Ня гледзячы на перашкоды і цяжкасьці, значных перабояў у выдачы тавару пайшчыкам ня было. 7 крам таварыства кожны месяц збываюць тавару на 60.000 руб.

Справаздачна-перавыбарчы сход упаўнаважаных, які адбыўся ў канцы сьнежня 1927 году, аднагалосна ўхваліў дзейнасьць праўленьня, даручыў яму наблізіць яшчэ больш сетку крам да спажыўца-селяніна.

Адзначаны ўзрост пайшчыкаў, якіх налічваецца больш 1500. Цяпер таварыства мае наявы капітал у 4.000 р. З фонду каапэраваньня беднаты, за 1-ы квартал 1927-28 году каапэравана 177 беднякоў-сялян.

Сход адбыўся пад знакам актыўнасьці членаў таварыства. Маецца на ўвазе пераход на 7-рублёвы пай. Гэта дасьць магчымасьць яшчэ больш увмацніцца, каб канчаткова выйсьці з пад уплыву прыватнага гандляра прымясцоваму сялянству.

Вывучэньне становішча лясоў мясц. значэньня.

ПК РСІ прыступіў да вывучэньня пытаньня аб задаволеньні сялянства драўнінай і аб становішчы лясоў мясцовага значэньня.

Адначасова заданьне РСІ ахоплівае пытаньне аб задаволеньні сялянства драўнінай наогул як з лясоў мясцовага значэньня, так і з дзяржаўнага лясного фонду, дзе таксама ёсьць недахопы.

Дакладнае высьвятленьне гэтага пытаньня ў значнай меры залежыць ад таго ўдзелу, які прымуць у гэтай працы мясцовыя савецкія, партыйныя, прафэсыйныя і грамадзкія ўстановы і арганізацыі, а асабліва шырокія масы насельніцтва.

Прадстаўнік ад УССР на сэсію ЦВК БССР.

На сэсію ЦВК БССР прыехаў Нам. Народнага Камісарыяту Асьветы УССР тав. Ряпко.

5.450 р. у карысьць палітвязьняў буржуазных турмаў.

У сьнежні ў Цэнтральны Камітэт Мопр'у БССР паступіла ад розных арганізацый у карысьць палітвязьняў буржуазных турмаў 5.450 руб. Грошы пасланы на прызначэньні.

Перавыбарная кампанія камітэтаў сялянскай узаемадапамогі.

На БССР закончваецца перавыбарная кампанія камітэтаў сялянскай узаемадапамогі. Згодна папярэдніх вестак, перавыбарныя сходы прайшлі актыўна. Новаабраным камітэтам даданы наказы павялічыць дапамогу беднаце шляхам арганізацыі машынных, насеннных і інш. т-ваў і каапэраваньня бяднейшага насельніцтва.

Папаўненьне Белдзяржмузэю.

Белдзяржмузэй закупіў на 3000 руб. карцін беларускіх мастакоў. Гэтыя карціны былі выстаўлены на ўсесаюзнай выстаўцы нацыянальнасьцяў у Маскве. Карціны ў хуткім часе будуць прывезены ў Менск.

Дапамога б. выхаванцам дзіцячых дамоў.

На стыпэндыі б. выхаванцам дзіцячых дамоў, якія цяпер навучаюцца ў вышэйшых навучальных установах, тэхнікумах і прафтэхшколах, згодна кантарысу Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі пры ЦВК БССР, у 1927-28 апэрацыйным годзе будзе адпушчана 6.000 руб.

Капітальнае будаўніцтва ў хімічнай прамысловасьці.

Зацьверджан плян капітальнага будаўніцтва ў хімічнай прамысловасьці. Згодна гэтага плану, у бягучым 1927-28 апэрацыйным годзе будзе затрачана ў хімічнай прамысловасьці на будаўніцтва 2.537.000 руб.

1.600.000 р. на крэдытаваньне рабочых.

Белрабсэкцыя зрабіла зваўку ў Маскву аб водпуску 1.600.000 руб. на крэдытаваньне рабочых у другім квартале 1927-28 г. Крэдытаваньне будзе адпускацца рабочым і служачым-пайшчыкам ЦРК.

100.000 руб. на ўзмацненьне савхозаў.

Белсельбанк адпусьціў Белсельтрэсту крэдыт у суме 100.000 руб. Гэтыя сродкі будуць скарыстаны на ўзмацненьне савецкіх гаспадарак БССР.

Вопыт лепшых ЦРК Саюзу перанесены ў БССР.

Белрабсэкцыя пастанавіла камандыраваць 12 працаўнікоў рабочай каапэрацыі ў лепшыя ЦРК Растова, Харкава і Тулы для азнаямленьня з пастаноўкай працы. Вопыт лепшых ЦРК будзе перанесен у нашу рабочую каапэрацыю.

Забясьпечаньне прамысловасьці сыравінай.

Лесбел заключыў догавар з „Бэлбумтрэстам" на дастаўку апошняму на 450.000 р. дроў і напіргольцу. Апрача таго, заключан догавар з „Белспиртрестам" на дастаўку асіны і фанэрнай волькі на суму каля 400.000 руб.

Рост укладаў у сельскай спажывецкай каапэрацыі.

У 1926-27 гаспадарчым годзе нізавая сетка спажывецкай каапэрацыі сабрала ўкладаў на суму 200.000 руб. Укладчыкамі з яўляюцца пераважна сяляне-пайшчыкі.

Пленум Менскага Акружкому ЛКСМБ.

13-га студзеня, а 2-й гадзіне ўдзень у клюбе «КІМ» склікаецца пленум Менскага Акружкому ЛКСМБ з наступнай павесткай дня:

1) Стан актыву і работа з ім. 2) Стан выкананьня дырэктыў аб удзеле ў рабоце сярод вясковай беднаты і батрацтва. 3) Аб скліканьні акруговай канфэрэнцыі.

4-я Менская акруговая канфэрэнцыя ЛКСМБ.

14-га студзеня а 5-й гадз. вечара ў клюбе Карла Маркса адчыняецца 4-я Менская акруговая канфэрэнцыя ЛКСМБ.

Парадак дню канфэрэнцыі.

1. Вынікі XV партызьезду. 2. Даклад ЦК ЛКСМБ. 3. Справаздача акружкому ЛКСМБ і рэв. камісіі. 4. Аб пікаэтаваньні. 5. Даклад „Чырвонай Зьмены". 6. Выбары: акружкому, рэвкамісіі, дэлегатаў на Усебеларускі і Усесаюзны зьезд ЛКСМ.

Розное.

САЛДАЦКАЕ ВЫБАРЧАЕ ПРАВА.

Са ўсіх дзяржаваў Эўропы і Амэрыкі толькі ў СССР і Фінляндыі салдаты і афіцэры маюць права выбіраць і могуць быць выбранымі ў дзяржаўныя органы ўлады.

Амаль што ва ўсіх іншых краінах салдаты зусім пазбаўлены выбарных правоў. У Турцыі, Грэцыі і Англіі яны маюць права выбіраць, але ня могуць быць выбранымі. А ў „дэмакратычнай" Польшчы дык арыгінальней за ўсіх: там ваенна-служачыя могуць быць выбранымі, але ня маюць права выбіраць.

ПЛАТА ЗА ЎДУШЭНЬНЕ ЗАБАСТОВАК.

У францускіх газэтах апублікован закон аб разьмерах платы вайскоўцам францускай армії. Падам тут найбольш цікавае месца ў гэтым законе: „Ваеннаслужачыя часьцей, прызваных на падтрыманьне парадку ў часе стачак (чытай—на ўдушэньне забастовак рабочых), атрымліваюць такую ўзнагароду: генэралы—па 43 франкі ў дзень, палкоўнікі—па 38, капітаны—па 30, паручнікі—па 26 і іншыя ваеннаслужачыя—па 18".

РАДЫЁСТАНЦЫЯ Ў БРОНЯАЎТАМАБІЛІ.

У Англіі адбылося выпрабаваньне радыёстанцый, устаноўленых на броняаўтамабілях. На выпрабаваньні правяралася сувязь паміж штабам вайсковага злучэньня і броняаўтамабілем на ходу. Выпрабаваньне дало станоўчыя вынікі.

ЗБОР ЗЛАЧЫНЦАЎ І БЕЛАГВАРДЗЕЙЦАЎ.

Дзеля ўдушэньня часных паўстаньняў качэўнікаў афрыканскай пустыні Сахары французкае вайсковае камандаваньне арганізавала там так званы чужаземны легіён. Гэты легіён адразу зрабіўся прыпынкам розных злачынцаў і праступнікаў. Сёлета большую частку навабраннаў склалі расейскія белагвардзейцы, якія мабыць страцілі надзею знайсьці сабе іншы заработак.

ПРЫРОСТ ТОРФУ Ў СССР.

На падліку праф. Рамзіна, гадавы прырост торфу ў СССР у чатыры разы перавышае патрэбу Саюзу ў апале. СССР мае тры чвэрткі кокасьці торфу на ўсім сьвеце.

СУД.

ВЯСКОВЫ ЗЬВЕР.

Грамадз. хут. Ялавіца, Самахвалаўскага райёну, Мікалай Іванаў Станілевіч, жыў на блізкай адлегласьці ад вёскі Стукацічы. Часамі Станілевіч, як малады хлапец, хадзіў гуляць да свайго сябра Уладзімера Палянчука ў вёску Стукацічы, дзе пазнаёміўся з дзяўчынай, Марыяй Шчурэвіч.

Нельга сказаць, каб Марыля была надта прыгожая дзяўчына, але па працаздольнасьці і характары яе лічылі лепшай дзяўчынай у вёсцы.

Ішлі дні, месяцы. Частыя спатканьні Станілевіча з Марыляй зблізілі іх. І яны ўступілі ў інтымную сувязь.

Аб сажыцельстве з Марыляй Станілевіч расказваў свайму сябру Палянчуку; апошні раіў Станілевічу не жаніцца з Марыляй, а знайсьці больш прыгожую дзяўчыну.

Калі Марыля стала цяжарнай і запрапанавала Станілевічу жаніцца, ён пачаў пэўнага не сказаў, а тым часам распрацоўваў пляны, як разьвязацца з Марыляй.

— Трэба забіць,—рашыў Станілевіч,—а то аліменты жыцьця не дадуць.

І раз увечары Станілевіч, узяўшы стрэльбу, падышоў пад вакно Марылі ў часе вячэры і забіў яе стрэлам праз вакно.

Аб забойстве Марылі ведаў адзін Уладзімер Палянчук, хоць сам удзелу ў гэтым і ня прымаў.

Пачалося сьледзтва. Станілевіч і Палянчук былі затрыманы і накіраваны ў праўчы дом, але на скончэньні сьледзтва да суду былі вызвалены з-пад варты. Апынуўшыся на волі, Станілевіч стаў прасіць Палянчука не выдаваць яго злачынства на судзе, абяцаючы даць за гэта 200 руб. ці на гэту суму лесу, бо брат Станілевіча быў лясьніком. Аднак, Палянчук рашыў высьветліць на судзе ўсё.

Каб замесьці зьлады злачынства, Станілевіч рашыў пазбавіцца сьведкі—свайго лепшага сябра Палянчука, і ўночы на 12 чэрвеня 1927 году, калі Палянчук пасьвіў коні, Станілевіч узяў стрэльбу, падышоў да Палянчука і застрэліў яго на месцы. Труп выцягнуў на дарогу і паніскаў калясом, каб атрымалася ўражаньне, што яго нехта забіў на дарозе.

Як ні вярцеўся Станілевіч, усё-ж было ўстаноўлена, што забойца Марылі і Палянчука—ён.

Менскі акруговы суд прыгаварыў Мікалая Іванавага Станілевіча на дзесяць гадоў зьняволеньня з суровым адмежаваньнем пазбаўленьнем у правах на тры гады без дастасаваньня да яго амністыі ўраду СССР.

Д. Кастроў.

СУДОВАЯ ХРОНІКА.

Растратчык.

Іван Лазаравіч, будучы загадчыкам аўцыённай залі Менскага Інвалідзнага Каапэрацыйнага аб'яднаньня, растраціў 658 р. і, каб схаваць сьляды злачынства, забіў таў грашовую справаздачнасьць.

Суд прыгаварыў Лазаравіча на год зьняволеньня, але на аснове амністыі ад кары вызваліў.

Абакраў каапэратыў.

Грамадз. вёскі Адзяніцы, Барысаўскага райёну, Захар Лыскавец у ноч на 25 красавіка 1927 г. зрабіў праломам даху ў крамы Адзяніцкага спажывецкага т-ва і пакраў розныя тавары на суму 90 руб.

Выязная сэсія Менскага акруговага суду прыгаварыла Захара Лыскаўца на тры гады зьняволеньня, але, прымаючы пад увагу малазначнасьць злачынства, скарацілі кару да аднаго году, а на аснове амністыі—з-пад варты вызвалілі.

Сахарына ў хлебе.

Арандатар млына хут. Барок, Бягомльскага райёну, Лейзар Фрыдман, 4 жніўня 1924 году варочаўся ад польскай мяжы і затрыман у м. Мсьціжы. Пры вобыску ва фурманцы знайдзена буханка хлеба, у якой Фрыдман вёз 10 фунтаў—канфіскаваных сахарыны.

Выязная сэсія Менскага акруговага суду прыгаварыла Лейзара Фрыдмана на год зьняволеньня без дастасаваньня амністыі з канфіскацыяй часткі маемасьці.

Ліст у рэдакцыю.

У сьнежні м-цы мінулага году ў гор. Магілеве выйшаў зборнік Ант. Скалкі „Заранкі". На вокладцы кніжкі зазначана: «Выданьне Ц. Б. Маладняка». Лічачы апошняе самай грубай, не захаванай фальсыфікацыяй, часовае кіраўніцтва, аб'яднаньнем «Маладняк» рашуча пратэстуе супроць такога самавольства з боку аўтара. Ц. Б. Маладняка ня ведала нават аб падрыхтоўцы да друку гэтага зборніку, ня кажучы ўжо аб тым, што ніякае згоды на выданьне яго не давала.

Ня маючы ніякае адносіны да выданьня зборніка „Заранкі" і да самога аўтара, Ант. Скалкі, Маладняк рашуча адмяжоўваецца ад таго і другога. Заначэньне зборніку „Выданьне Ц. Б. Маладняка" ні больш, ні менш, як напраўдзаемы пічатка подроб аўтара і поўная адказнасьць за гэта падае на яго самога.

Часовая кіраўніцтва Маладняка.

ЗДАРЭНЬНІ.

ПАКРАЖА.

На школьнаму завулку 7 з кватэры І. Жданоўча невядомыя злачынцы ўкралі 100 руб. золатам, 100 руб. серабром, 70 руб. чырвонцамі і на 200 руб. розных рэчаў.

ЗАТРЫМАНЬНЕ ЗЛОДЗЕЯ.

Крымінальны вышук затрымаў у Менску злодзея Д. Праўніка, які прыехаў з Гомеля на гастролі. У Менску ён украў у магазыне МЦРК у гр-кі Кірубін 45 руб. Грошы знойдзены і зьвернены папярэшуй.

НАГЛАЯ СЬМЕРЦЬ.

У вёсцы Крывая-Вароза (Меншчына) нагла намёр гр-н А. Кулеш 70 гадоў ад роду. Ёсьць падазрэньне, што Кулеша атруціла яго радня.

Паштовая скрынка.

Селькора Горацкага р. (Аршаншчына), аўтара карэспандэнцыі аб перавыбарах у спажывецкай каапэрацыі рэдак